Роднея газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЖНІЎНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 143 (26501)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.





## Аляксандру Лукашэнку прадстаўлены даклад аб бягучай сітуацыі са складскімі запасамі і рэалізацыяй прадукцыі вядучых прадпрыемстваў

**Кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку прадстаўлены даклад аб бягучай сітуацыі са складскімі запасамі і рэалізацыяй прадукцыі вядучых прадпрыемстваў краіны.**

Як вядома, 23 ліпеня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даручыў сваёй Адміністрацыі праводзіць пастаянны маніторынг змянення запасаў гатовай прадукцыі і асобных пытанняў вытворча-фінансавай дзейнасці ключавых прадпрыемстваў, якія вызначаюць развіццё галін і рэгіёнаў, а таксама прадпрыемстваў, што выпрацоўваюць прадукты харчавання.

Азнаёміўшыся з дакладам, кіраўнік дзяржавы чарговы раз указаў на тое, што з кіраўнікоў будзе жорсткае патрабаванне за рэалізацыю выпрацаванай прадукцыі і асабліва за прыхарошванне стану спраў шляхам рознага роду маніпуляцый са звесткамі, у выніку якіх выпушчаная прадукцыя «пераганяецца» па паперах.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: крытэрый ацэнкі будзе адзін — рэальнае паступленне сродкаў за прададзеныя тавары.

Прэзідэнт даручыў Камітэту дзяржаўнага кантролю ажыццяўляць праверкі фактаў продажаў тавараў канчатковым спажыўцам, а таксама ўмовы і тэрміны аплаты.

Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь будзе штотыдзень дакладваць кіраўніку дзяржавы аб выніках маніторынгу.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Юрыдычныя асобы ў Беларусі будуць набываць тавары толькі ў вытворцаў або іх гандлёвых прадстаўнікоў

**Юрыдычныя асобы незалежна ад арганізацыйнай прававой формы будуць набываць на тэрыторыі Беларусі тавары за кошт уласных, пазыковых сродкаў, а таксама сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў толькі ў вытворцаў і іх афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 28 ліпеня № 991 «Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», паведамілі ў Апараце Савета Міністраў.**

Пералікі афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў зацвярджаюцца адпаведнымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання на падставе заяў пастаўшчыкоў, якія з'яўляюцца вытворцамі тавараў. Да іх прыкладаюцца дакументы, што пацвярджаюць эканамічную абгрунтаванасць набыцця тавараў у афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў, па ўзгадненні з намеснікамі прэм'ер-міністра Беларусі згодна з курыруемымі напрамкамі. У сувязі з гэтым дзяржаўныя закупкі за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, уключаючы дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя фонды, а таксама за кошт дзяржаўных пазабюджэтных і інавацыйных фондаў таксама ажыццяўляюцца ў пастаўшчыкоў, якія з'яўляюцца вытворцамі тавараў або ў афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў вытворцаў гэтых тавараў. Дакумент накіраваны на забеспячэнне эфектыўнага расходавання грашовых сродкаў і правядзенне на тэрыторыі Беларусі адзінай фінансавай палітыкі з улікам уплыву фактараў сусветнага фінансавага і эканамічнага крызісу.

Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**БЕЛТА.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Швейцарыі

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 1 жніўня павіншаваў Федэральнага Прэзідэнта Швейцарскай Канфедэрацыі Ганса-Рудольфа Мерца з нацыянальным святам — Днём заснавання Канфедэрацыі.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць у тым, што ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва Беларусі і Швейцарыі будзе паспяхова развівацца на карысць дзвюх краін.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь выканала дамоўленасці з Расспажыўнаглядам па пастаўках малочнай прадукцыі

**Аб гэтым паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіл САВЕЛЬЕЎ.**

«Мы выканалі дамоўленасці, якія былі дасягнуты з Расспажыўнаглядам, — сказаў Міхаіл Савельеў. — На тую прадукцыю, якую нашы прадпрыемствы хочуць пастаўляць у Расію, заключэнні атрыманы». Пры гэтым намеснік міністра ўдакладніў, што беларускімі прадпрыемствамі атрымана 624 санітарна-эпідэміялагічныя заключэнні на розныя віды малочнай прадукцыі, у тым ліку 172 з іх на новыя віды такой прадукцыі. «Мы пераафармілі тыя дакументы, якія раней планавалі», — дадаў ён.

Асартыментны пералік малака і малочнай прадукцыі перапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі, на якія аформлены санітарна-эпідэміялагічныя заключэнні згодна з новым расійскім тэхналагічным рэгламентам, размешчаны на сайце Мінсельгасхарча Беларусі. У ходзе асваення беларускімі малаказаводамі новых відаў прадукцыі, прызначаных для экспарту ў Расію, атрыманне санэпідзаключэнняў лабараторый Расспажыўнагляду будзе праходзіць у рабочым парадку.

**БЕЛТА.**

## Пакуль мост на рэканструкцыі...

**Па прычыне будаўніцтва аб'екта «Рэканструкцыя моста цераз р. Свіслач па вул. Першамайскай» у сталіцы і закрыццём руху ўсіх відаў транспарту па вуліцы Першамайскай на ўчастку ад вуліцы Пуліхава да вуліцы Я. Купалы з панядзелка, 3 жніўня, і да заканчэння работ уносяцца змяненні ў працу пасажырскага транспарту.**

Так, як паведамілі ў КУП «Мінсктранс», рух трамваяў маршруту №1 з боку разваротнага кальца Валгаградская арганізуецца да вуліцы Батанічная (з разваротам у парку) па вуліцах З. Бядулі, Чапаева, Платонава. Праца трамваяў маршрутаў №№ 2, 4, 7 не плануецца. Рух аўтобусаў маршруту № 57 арганізуецца па вуліцах Пуліхава, Першамайская, Захарава, праспекце Незалежнасці, вуліцы Я.Купалы ў абодвух напрамках. Каб кампенсаваць зняты трамвайны рух, будзе арганізаваны часовы аўтобусны маршрут № 146 «ДС «Дружная» — вул. З. Бядулі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### КАВАРНЫЯ РАЧУЛКІ

**Невялікія рэчкі, якія ў іншыя гады можна перайсці ўброд, забралі пяць чалавек у гэтыя выхадныя дні на Гомельшчыне.**

Ля Чачоры, што цячэ ў Буда-Кашалёўскім раёне, адпачывалі разам з сем'ямі двое мужчын. Адзін з іх, 28-гадовы, падплыў блізка да невялікай дамбы са шлюзам, якія былі залітыя вадой з-за дажджоў. Нечакана рачны паток перакінуў яго праз дамбу і закруціў у вадавароце, як расказаў **вядучы спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі таварыства выратавання на вадзе Сяргей КАСЦЮЧЭНКА.** Другі, 32-гадовы, кінуўся яго ратаваць, але таксама не змог справіцца са стыхіяй вады. Цела аднаго сваякі хутка знайшлі недалёка ад месца здарэння, а другога тапельца падняла манеўрана-пошукавая група Гомельскага таварыства выратавання на вадзе. На выхадных у рачулцы Хорапуць, што цячэ праз Добруш, патануў 17-гадовы школьнік, якога спрабавалі, але не змаглі выратаваць сваякі. На мясцовым возеры ў Мазырскім раёне ля вёскі Жаковічы загінуў 46-гадовы пастух мясцовага СВК «Крынічны». У стане алкагольнага ап'янення быў 44-гадовы мужчына, які патануў у рэчцы Покуць у Чачэрскім раёне. Усе здарэнні адбыліся на так званых «дзікіх» пляжах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПАЛЁТ НАД БЯРЭЗІНАЙ





**«Стоп негатыву — ёсць пазітыву!». Пад такім дэвізам у першыя дні жніўня за дзесяць кіламетраў ад Барысава прайшоў першы Фестываль Тралея. Над Бярэзінай былі нацягнуты спецыяльныя канаты — першы над вадой, другі — часткова ў вадзе, на якіх маглі пакатацца ўсе зарэгістраваныя ўдзельнікі фестывалю. Больш за паўтысячы чалавек маглі не толькі пакатацца на тралеях, але і паўдзельнічаць у розных конкурсах: забрацца на вежу з піўных скрыняў, паспрабаваць пахадзіць на нацягнутых канатах, пабудаваць нешта з пяску, перамагчы ў чэмпіянаце па валейболе. Усе атрыманыя ад фестывалю сродкі арганізатар мерапрыемства — Федэрацыя Прыгодніцкіх Гонак — накіруе ў фонд аховы дзяцей «Падары дзецям усмешку!»**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Барысаўскі раён.*



### Грошы

## Змяніліся цэны на каштоўныя металы

**Пастановай Міністэрства фінансаў з 1 жніўня зацверджаны новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асобаў (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асобаў), і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. Дагэтуль апошні раз яны змяняліся з 1 ліпеня, перад тым — з 1 сакавіка.**

Цяпер скупачныя цэны ў рублях па пробах за грам металу наступныя. Золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 26 290 рублёў (на пачатак мінулага месяца скупачная цана была вызначана ў памеры 26 610 рублёў), 500-й пробы — 35 050 рублёў (было 35 480 рублёў), 583-й і 585-й пробы — 41 010 рублёў (41 510 рублёў), 750-й пробы — 52 570 рублёў (53 210 рублёў), 900-й пробы — 63 090 рублёў (63 860 рублёў), 916-й пробы — 64 210 рублёў (64 990 рублёў), 950-й пробы — 66 590 рублёў (67 400 рублёў), 958-й пробы — 67 150 рублёў ( 67 970 рублёў). Плаціна ў вырабах і ломе 950-й пробы — 82 380 рублёў (87 440 рублёў). Серабро ў вырабах і ломе: 750-й пробы — 750 рублёў (840 рублёў), 800-й пробы — 800 рублёў (890 рублёў), 875-й пробы — 870 рублёў (980 рублёў), 916-й пробы — 910 рублёў (1 020 рублёў), 925-й пробы — 920 рублёў (1 030 рублёў), 960-й пробы — 960 рублёў за грам металу (1 070 рублёў).

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

### Антыкрызісная эканоміка

## МАНТАЖНАЯ ПЕНА ЦЯПЕР — СВАЯ

**Мінулым летам у свабоднай эканамічнай зоне «Брэст» пачалося ўзвядзенне карпусоў новага прадпрыемства «Белінэка» па вытворчасці поліурэтанавай мантажнай пены. Калі распачыналася будаўніцтва, скептыкі са спасылкай на крызіс прадказвалі заводу складаную будучыню, цяжкасці са збытам прадукцыі. Але падобныя прагнозы не збыліся. І сёння адзінае ў рэспубліцы прадпрыемства-вытворца мантажнай пены паспяхова асвойвае рынкі збыту. Літаральна днямі ААТ «Белінэка» атрымала статус вытворцы імпартазамяшчальнай прадукцыі.**

У адзін з новых цэхаў нядаўна завезена швейцарская лінія па выпуску тары — бляшаных балонаў для пены. Такім чынам, на брэсцкім прадпрыемстве прадукцыя будзе ўпакоўвацца нават ва ўласную тару. А магутнасць лініі такая, што яна забяспечыць не толькі свае патрэбы, але дазволіць прадаваць балоны іншым прадпрыемствам.

У нашай краіне мантажная пена ўжо паспяхова прадаецца на працягу двух месяцаў. Паводле слоў **намесніка дырэктара ААТ Фарыда РАХМАТУЛІНА,** перад заводам стаіць задача насыціць унутраны рынак, а затым арганізоўваць пастаўку за мяжу.

На мінулым тыдні ААТ «Белінэка» ў шэрагу іншых прадпрыемстваў СЭЗ «Брэст» наведаў першы віцэ-прэм'ер краіны Уладзімір Сямашка. Разам са старшынёй аблвыканкама Канстанцінам Сумарам яны пазнаёміліся з вытворчым цыклам новага завода, пагаварылі з яго працаўнікамі. Уладзімір Сямашка выказаў задавальненне ад пабачанага і паабяцаў экспартаарыентаваным і імпартазамяшчальным прадпрыемствам дапамогу і падтрымку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ВЫРАБЛЕНАЕ — ПРАДАЦЬ

**Мінгарвыканкам штотыдзень адсочвае эканамічную сітуацыю на 20 валаўтваральных прадпрыемствах сталіцы.**

У спісе такія прадпрыемствы, як МАЗ, «Атлант», завод колавых цягачоў, трактарны, «Керамін», «Элема», «Мілавіца» і іншыя. Асноўная ўвага надаецца аб'ёмам вытворчасці і продажу, руху запасаў гатовай прадукцыі. Дырэктарам названых прадпрыемстваў пастаўлена задача, каб «тэмп росту продажу апярэджваў рост вытворчасці». На працягу мінулага тыдня аўтамабільны завод вырабіў прадукцыі на 36 мільярдаў рублёў, а адгрузіў на 35 мільярдаў, трактарны — на 28 і 64 мільярды адпаведна з улікам складскіх запасаў. «Мілавіца» выпусціла тавараў на 103 мільярды рублёў, рэалізавала на 115 мільярдаў.

Усяго ў сталіцы 348 прадпрыемстваў за першае паўгоддзе (14,2 працэнта ад агульнай колькасці) атрымалі чыстую страту. За месяц іх стала на 31 менш. Зніжэнне колькасці стратных прадпрыемстваў назіраецца практычна ва ўсіх галінах гарадской гаспадаркі.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯНЕ СТАЛІ БОЛЬШ ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСАЎ І МЕНШ АМЕРЫКАНЦАЎ

**Расіяне сталі больш талерантна ставіцца да ўсіх народаў. Прычым колькасць сімпатызуючых народам Сярэдняй Азіі вырасла ў чатыры разы, гаворыцца ў даследаванні, праведзеным цэнтрам Усерасійскага цэнтра даследавання грамадскай думкі. Усім рэспандэнтам задавалі пытанне: «Да прадстаўнікоў якіх нацыянальнасцяў вы ставіцеся з найбольшай сімпатыяй, а да якіх — з непрыязнасцю».**

Паводле вынікаў апытання, лепш за ўсё расіяне ставяцца да саміх сябе, беларусаў (13 працэнтаў супраць 7 у 2006 годзе), украінцаў (11 працэнтаў супраць 8 у 2006 годзе) і прадстаўнікоў славянскіх народаў у цэлым (31 працэнт супраць 34). Наступныя ў спісе — жыхары Заходняй Еўропы. У сімпатыі да іх прызналіся 7 працэнтаў апытаных — у два разы больш, чым тры гады таму. Але прыкметней за ўсё — у чатыры разы — палепшылася стаўленне расіян да выхадцаў з Сярэдняй Азіі. У сімпатыі да таджыкаў, узбекаў і казахаў прызналіся 4 працэнты апытаных, супраць 1 працэнта ў 2006 годзе.

На другую частку пытання — аб антыпатыях — 55 працэнтаў апытаных (у параўнанні з 41 працэнтам у 2006 годзе і 34 працэнтамі ў 2003) адказалі адмоўна, заявіўшы аб адсутнасці непрыязнасці да прадстаўнікоў якой-небудзь нацыянальнасці. З іншага боку, у «антырэйтынгу» як і раней лідзіруюць прадстаўнікі народаў Каўказа — 29 працэнтаў апытаных заявілі аб сваёй нелюбові. Гэтак жа значна (у тры разы — з аднаго да трох працэнтаў) вырасла колькасць тых, хто не любіць амерыканцаў. І з'явіліся (у 2006 годзе ніхто не прызнаўся ў антыпатыі да іх, а цяпер — два працэнты апытаных) тыя, хто негатыўна ставіцца да англічан, немцаў, французаў і іншых жыхароў Заходняй Еўропы. Акрамя названых нацыянальнасцяў, у першых радках «антырэйтынгу» фігуруюць цыгане (4 працэнты), кітайцы, украінцы і прыбалты — па 3 працэнты.

### У ЛІТВЕ СКАРАЦІЛІ ЗАРПЛАТЫ ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ

**У Літве ўвайшоў у сілу закон аб часавым скарачэнні базавага акладу палітыкаў, суддзяў, дзяржаўных службовых асобаў і службоўцаў. З 1 жніўня па 31 снежня 2009 года базавая частка зарплаты для гэтых катэгорый будзе складаць 450 літаў замест ранейшых 475.**

Адпаведны закон прыняты соймам Літвы і падпісаны прэзідэнтам Даляй Грыбаўскайтэ. Поўны аклад літоўскіх дзяржслужачых разлічваецца шляхам множання базавай часткі на службовыя каэфіцыенты. Самі каэфіцыенты, паводле прынятага закона, таксама былі паменшаныя. Паводле разлікаў урада, у выніку зарплаты названых у законе катэгорый бюджэтнікаў павінны скараціцца на 15-24,5 працэнта.

### МАДОННА ПАКАЖА ДЗЕЦЯМ АСВЕНЦІМ



**Поп-спявачка Мадонна хоча ўзяць сваіх дзяцей на экскурсію ў фашысцкі канцэнтрацыйны лагер Асвенцім пасля свайго канцэрта ў Польшчы. Пра гэта піша The Daily Mirror са спасылкай на крыніцу, блізкую да зоркі.**

Спявачка лічыць, што гэтая паездка павінна змяніць жыццё яе дзяцей — 12-гадовай Лурдэс, 8-гадовага Рокка, 4-гадовай Мэрсі і 3-гадовага Дэвіда. Паводле інфармацыі крыніцы, Мадонна хоча, каб яе дзеці зразумелі, як ім пашчасціла, і даведаліся аб памылках, дапушчаных чалавецтвам у мінулым.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### СОНЕЧНА, АЛЕ НА ВЫХАДНЫЯ ПАХАЛАДАЕ

**На гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі прыйдзе сапраўды камфортнае летняе надвор'е, калі ў нашай краіне ўсталюецца ўстойлівая зона павышанага ціску, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.**

На працягу тыдня ў большасці рэгіёнаў краіны захаваецца сонечнае надвор'е, толькі сёння месцамі па Брэсцкай і Гомельскай абласцях пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўдзень у аўторак і сераду 21—27, уначы — 10—17 градусаў.

А вось у чацвер чакаецца змена паўднёвых вятроў на паўночныя, і ў Беларусь пачне паступаць больш свежае паветра паўночных шырот. Нейкіх істотных ападкаў такая змена надвор'я не прынясе, але істотна пахаладае. Такім чынам у многіх раёнах захаваецца сонечнае надвор'е, толькі на ўсходзе месцамі магчымыя невялікія дажджы. Тэмпература паветра ў другой палове тыдня ўначы 8—15, а ў ночы на нядзелю па Віцебскай і Магілёўскай абласцях яна панізіцца да 5—6 цяпла, удзень — ад 17—19 па паўночным усходзе да 24—25 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

І ТАК БЫВАЕ

### ПЯТНАЦЦАЦЬ ТРУСОЎ

**апрануў на сябе грамадзянін Украіны, каб правезці тавар на тэрыторыю нашай краіны.**

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, арыгінальнага кантрабандыста «рассакрэцілі» ў пункце пропуску «Верхні Церабяжоў» пінскія памежнікі і супрацоўнікі мытні. Мужчына, які знаходзіўся ў салоне аўтамабіля «Фіят», звярнуў на сябе ўвагу незвычайным знешнім выглядам і яго было вырашана даглядзець. Уявіце сабе карціну, калі небарака пачаў па чарзе «дэманстраваць» усё лішняе, што нацягнуў на сябе для правозу праз мяжу: як высветлілася, на мужчыне было апранута чатыры спартыўныя касцюмы, трое штаноў і ўжо згаданых пятнаццаць трусоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ЗАЛАТАЯ» РЫБКА

**Мінгарвыканкам выявіў факты масавага завышэння цэнаў на рыбу і морапрадукты на рынках. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення цэнаснай палітыкі гарвыканкама Іосіф РАЧЫЦКІ на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.**

«У ліпені ўпраўленне праверыла выкананне цэнаснага заканадаўства на рыбу і морапрадукты. Вынікі рэвізіі паказалі, што сітуацыя несуцяшальная — каля 70 % правераных прадпрыемстваў дапускалі парушэнні, асабліва ў рознічнай сетцы», — канстатаваў Іосіф Рачыцкі. Цэны былі завышаны ад Br430 за 1 кг (філе сайды свежамарожанай) да Br8 тыс. (масленая рыба халоднага вэнджання).

Завоблачныя цэннікі на рыбу і морапрадукты спецыялісты зафіксавалі на рынку «Ракаўскі кірмаш», у гандлёвым цэнтры «Аэрадромны», на Камароўскім рынку. Крыху лепшая сітуацыя ў крамах горада, бо ўпраўленне спажывецкага рынку мэрыі кантралюе кошт тавараў.

**Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.**

### ДЗЕСЯЦЬ ПАЖАРАЎ АД МАЛАНКІ

**Моцныя навальніцы з громам, маланкай, якія прайшлі ў ваколіцах Брэста ноччу і раніцай 3 жніўня, справакавалі дзесяць пажараў.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ,** найбольш пацярпелі ад навальніцы Брэсцкі, Маларыцкі, Кобрынскі раёны. У выніку пажараў, справакаваных ударамі маланкі, агнём пашкоджана сем гаспадарчых пабудоў і два жылыя дамы. Праўда, у жылых дамах, якія пацярпелі ў вёсках Медна Брэсцкага раёна і Астромічы Кобрынскага раёна, ачагі ўзгарання хутка ўдалося лакалізаваць, і жыллю нанесены невялікі ўрон. Паведамленняў пра пацярпелых на гэтых пажарах няма.

Выратавальнікамі і міліцыяй правяраецца версія ўдару маланкі як прычыны пажару, у выніку якога загінуў пастух СВК «Рыта» Маларыцкага раёна. Яго цела знайшлі на полі ў вагончыку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ДЗІЧЫНА ЧАКАЕ!

**У Беларусі распачаўся чарговы летне-асенні сезон палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну (у тым ліку гусь белалобую, гусь-гуменіка, гусь шэрую), перапёлку, вальдшнэпа, шызага голуба, вяхіра.**

Здабываць дазваляецца птушак любога полу і ўзросту стрэльбавым спосабам з засады, з падманьваннем, з падыходу, з пад'езду, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі (акрамя хартоў і ганчакоў), бясстрэльбавым — з лоўчымі птушкамі. Дарэчы, здабываць бакаса можна было яшчэ раней — паляванне на гэтую птушку дазволена з другой суботы ліпеня для ўладальнікаў выжлаў. Паляванне на вадаплаўную і балотную птушку будзе доўжыцца па другую нядзелю снежня ў светлы час сутак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У ГОСЦІ ДА БАБУЛІ

**прыехала з Гомеля 20-гадовая ўнучка — у вёску Махновічы Мазырскага раёна. Каб адпачываць было весялей, выкрала ў бабулі грошы: 1700 еўра і 5,5 мільёна беларускіх рублёў, а таксама 400 еўра, якія належалі жанчыне з вёскі Козенкі.**

Вялікай сумы грошай недалічылася і 90-гадовая гамяльчанка, да якой напярэдадні завіталі дзве жанчыны цыганскай нацыянальнасці. Яны задурылі галаву сталай жанчыне: сказалі, што праводзяць перапіс насельніцтва, але ж пасля візіту незнаёмак зніклі 400 долараў ЗША.

### КУДЫ ІДЗЁМ МЫ З ПЯТАЧКОМ...

**Ля вёскі Кошчычы Калінкавіцкага раёна з пчальніковай гаспадаркі выкрадзена 5 вулляў разам з пчоламі.**

Ад невядомага «Віні-Пуха» застаўся толькі след машыны, на якой былі вывезеныя насякомыя. Між тым, прыхільнікаў паласавацца салодзенькім даволі шмат, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама. Каля дома жыхара вёскі Ясенец на Мазыршчыне невядомы ўкраў 20 рамак з мёдам з 2 вулляў. У пчаляра вёскі Барсукі Кармянскага раёна з тэрыторыі яго дачы знік пчаліны вулей разам з сям'ёй пчол і 15 кілаграмамі мёду. Тры пустыя вуллі былі выкрадзеныя з хлява на дачы ў вёсцы Салонская Карма Жлобінскага раёна. А вось жыхару Светлагорска пад выглядам мёду падсунулі два трохлітровыя слоікі падфарбаванага сахарнага сіропу, за якія ён заплаціў 95 тысяч рублёў. Як казаў казачны Віні-Пух: гэта няправільныя пчолы, яны робяць няправільны мёд. Хоць пчолы тут, вядома, ні пры чым.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «ЗАЛАТЫЯ» ЮНІЁРЫ

**Юніёрскі чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы завяршыўся ў шведскай Ландскруне. Беларусы заваявалі тры залатыя медалі.**

Чэмпіёнам Еўропы ў вагавой катэгорыі да 77 кг стаў Казімір Фіцнер, які падняў у суме 327 кг. У вагавой катэгорыі да 75 кг з сумай 227 кг перамагла Юлія Наваковіч. У вазе да 69 кг на вышэйшую ступень п'едэстала ўзнялася Марына Шкерманкова. Беларуска адолела штангу вагой 217 кг. Адзначым таксама, што ў кроку ад п'едэстала спыніліся Аляксандр Макаранка ў катэгорыі да 94 кг і Наталля Колас у катэгорыі да 58 кг.

**БЕЛТА.**


ТЕАТР «АКРОПОЛЬ»
в связи с активным развитием сети
ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ
во всех населенных пунктах РБ:

- АДМИНИСТРАТОРОВ
- ИНСТРУКТОРОВ ПО ВОСТОЧНЫМ И ЭСТРАДНЫМ ТАНЦАМ
- ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ АКТЕРСКОГО МАСТЕРСТВА И ВОКАЛА

Проводится предварительная подготовка, возможна подготовка кандидатов с нуля.
Официальное трудоустройство, соцпакет, достойная заработная плата.
Тел.: 8(025) 9 100 200 УНП 191111246.


Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 823,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 014,59 |
| 1 латвійскі лат | 5 718,63 |
| 1 літоўскі літ | 1 163,40 |
| 1 чэшская крона | 156,93 |
| 1 польскі злоты | 975,13 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 90,36 |
| 1 украінская грыўня | 360,31 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,2424 |
| UAH | 39,8754 |
| 1000 BYR | 11,0475 |
| EUR | 44,4642 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009



ISSN 1990 - 763X

# ПАДАТКОВАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА ЧАКАЕ СПРАШЧЭННЕ

**Практычна ўсе рэкамендацыі па спрашчэнні падатковага заканадаўства, прапанаваныя Беларускім саюзам прадпрымальнікаў, падтрыманы працоўнай групай па спрашчэнні падатковай сістэмы РБ пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова. Пра гэта паведаміў журналістам старшыня БСП Аляксандр КАЛІНІН:**

— Пасля рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў мы павінны зпаўзці з апошняга месца па індыкатары «сістэма падаткаабкладання» ў рэйтынгу Сусветнага банка і Міжнароднай фінансавай карпарацыі «Doing Business»(Беларусь займае апошняе, 181-е, месца, Украіна — 180-е, Польшча — 142-е, Расія — 134-е, Літва — 57-е, Латвія — 36-е, Эстонія — 34-е. — **Заўв. аўт.**). На колькі пазіцый — залежыць ад паказчыка падатковай нагрузкі. Але калі прапанаваныя мерапрыемствы будуць рэалізаваныя, то мы знізім працаёмістасць падатковага ўліку працэнтаў на 40, ну і таксама скароцім колькасць саміх плацяжоў, — лічыць Аляксандр Калінін.

Самым важным крокам сярод цэлага шэрагу прапаноў старшыня БСП назваў устанаўленне для арганізацый, у якіх сума выручкі ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг) не перавышае Br3,5 мільярда ў год, магчымасці выплаты падатку на прыбытак і падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) або штомесячна, або штоквартальна на выбар.

— Гэта сур'ёзная рэвалюцыя, таму што найбольш працаёмістымі — да 80 % ад падатковых разлікаў — з'яўляюцца падатак на прыбытак і ПДВ, — кажа старшыня БСП. — Па нашых падліках, гэтым правам скарыстаюцца 3/4 арганізацый. Мы аналізавалі, і для бюджэту касавы разрыў па гэтай групе не будзе крытычны пры пераходзе са штомесячнага на штоквартальны тэрмін. Затое акрамя спрашчэння падатковай сістэмы, у арганізацыі з'явіцца эфект папаўнення зваротных сродкаў.

Сур'ёзным крокам Аляксандр Калінін бачыць і распаўсюджванне падатку, які разлічваецца ад валавога даходу, пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання на прадпрыемствы сферы рознічнага гандлю і грамадскага харчавання з сярэдняй колькасцю працаўнікоў не больш за 15 чалавек. Гэта павінна станоўча паўплываць на развіццё, напрыклад, невялікіх кавярняў і бараў.

Акрамя таго, у прапановы працоўнай групы па спрашчэнні падатковай сістэмы ўваходзяць адмена збору ў рэспубліканскі фонд с/г прадукцыі, падатку з продажу тавараў у рознічным гандлі (застаецца пакуль падатак на паслугі), мясцовых мэтавых збораў, падатку на набыццё транспартных сродкаў, а таксама адмена права мясцовых Саветаў дэпутатаў на ўсталяванне павышальных каэфіцыентаў да ставак зямельнага падатку і падатку на нерухомасць. Усё гэта плануецца зрабіць з 1 студзеня 2010 года. Плануецца і шэраг змяненняў у падатковым заканадаўстве для спрашчэння парадку адлюстравання расходаў, спагнання экалагічнага падатку, падатковага адміністравання і кантролю, а таксама ў мэтах актывізацыі працэсу прыцягвання інвестыцый.

Каб павысіць стабільнасць па-даткновага заканадаўства і выключыць мноства дакументаў у сферы падаткаабкладання, з 1 студзеня 2010 года прапануецца ўвесці ў дзеянне Асаблівую частку Падатковага кодэкса. Тут будуць прапісаны парадак вылічэння па кожным рэспубліканскім падатку ці зборы, па мясцовых падатках, асаблівых рэжымах падаткаабкладання, а таксама вызначаны ўсе іншыя элементы — плацельшчыкі, аб'екты, падатковая база, стаўкі, тэрміны і г.д.

— Мы імкнёмся, каб у малым бізнэсе наогул не быў патрэбны бухгалтар, — кажа Аляксандар Калінін. — Напрыклад, каб дырэктар вёў кнігу ўліку даходаў-выдаткаў, плаціў 8 % з выручкі. Але як толькі кранаемся зарплаты, бальнічных, асабліва разлікаў з «дэкрэтамі», то там патрэбны прафесійны разлік.

Аляксандр Фядотавіч расказаў, што ў малым бізнэсе часта бываюць сітуацыі, калі фірма не можа выплаціць дапамогу. Ён лічыць, што калі прадпрыемства спраўна адлічвае ў ФСАН, то не яго функцыя яшчэ і сацдапамогу выпісваць, гэта функцыя дзяржорганаў, якія цяпер рэагуюць на такія запыты вельмі марудна:

— Прадстаўнікі Мінпрацы не разумеюць, як можа скласціся сітуацыя, што фонд вінен прадпрыемству, — расказвае Аляксандр Фядотавіч. — Ды проста, гэта ж малое прадпрыемства — пайшла працаўніца ў «дэкрэт», ёй налічылі дапамогу, аддалі, і ўсё, грошай няма. Пакуль запыты ў фонд, пакуль там вырашаць пытанні, праходзіць тры-чатыры месяцы. Карацей, мы таксама абазначылі праблему па фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Інфарм-укол

### САЛОДКАЕ — РАЗАМ З ІНШАЙ ЕЖАЙ

**Інфармацыя аб тым, што цукар робіць свой унёсак у карыес, не новая. Аднак размова ідзе, хутчэй за ўсё, не пра сам цукар, а пра... ферментуючыя вугляводы, да якіх адносяцца не толькі ўсе віды цукру, але і практычна ўсе віды крухмалу, у тым ліку хлеб, крэкеры і бульбяныя чыпсы.**

Не зніжайце ўжыванне вугляводаў, паколькі яны — каштоўны кампанент здаровай дыеты. Догляд зубоў не азначае поўнага адмаўлення ад марожанага, пірожных, пірагоў і іншых прысмакаў. У гэтым выпадку не так важна тое, якую колькасць цукру вы ўжываеце, а тое, якім чынам вы гэта робіце. Салодкае, якое вы ясце паміж прыёмамі ежы, наносіць зубам большую шкоду, чым падчас ежы.

***Паспрабуйце прытрымлівацца наступнага:***

■ Пазбягайце клейкіх, салодкіх прадуктаў, якія доўга жуюцца, асабліва лёгкіх закусак. Такія прадукты, як цукеркі, глазураваныя арэхі, дрэнна прапечаны хлеб, разынкі, прыліпаюць да зубоў. Калі вы з'елі штосьці, не забудзьцеся пачысціць зубы на працягу 20 хвілін. Кіслата, якая выпрацоўваецца бактэрыямі, што выклікаюць карыес, дасягае піку сваёй актыўнасці менавіта ў гэты момант. Калі зубы пачысціць нельга, прапаласніце рот вадой.



■ Асцярожна выбірайце лёгкія закускі. Яны наносяць арганізму больш шкоды, чым звычайны прыём ежы, які ўключае ў сябе тыя ж самыя прадукты. Пастаяннае жаванне на працягу дня дазваляе бактэрыям выпрацоўваць кіслату на зубах. Калі ж вы вырашылі пажаваць жуйку ці пасмактаць карамельку, выбірайце тыя, што без цукру, з ксілітолам ці аспартамам, якія забіваюць бактэрыі.

■ Нельга даваць дзецям бутэльку малака ці соку перад сном. Калі для заспакаення дзіцяці патрабуецца бутэлечка, напоўніце яе вадой. Не дазваляйце дзіцяці піць з бутэлечак у ложку, таму што гэта можа выклікаць закупорку еўстахіевай трубы і павысіць рызыку інфіцыравання вуха.

### НАЧНОЕ СКРЫГАТАННЕ

**Такія стымулятары, як тытунь і кафеін могуць прымусіць наш арганізм павялічыць выпрацоўку адрэналіну, які спрыяе абвастрэнню такога стану, як бруксізм, распаўсюджанага расстройства сну.**

Бруксізм — скрыпенне, скрыгатанне або сціскание зубоў у сне ці ў такіх сітуацыях, калі чалавек адчувае неспакой або напружанне. Як правіла, бруксізм пачынаецца рана ноччу і можа парушаць сон тых, хто побач. Некаторыя людзі досыць гучна скрыпяць зубамі, але не ў стане паўтарыць гэтыя гукі пасля прачынання або ў расслабленым стане. А іншыя людзі не выдаюць ніякіх гукаў і адмаўляюць магчымасць з'яўлення ў іх такога стану, нават калі ў іх зламаны зуб. Прычынамі бруксізму могуць быць: няправільнае размяшчэнне верхніх і ніжніх зубоў, неспакой, стрэс ці напружаны стан, падаўлены гнеў або расчараванне, агрэсіўны, суперніцкі або гіперактыўны тып асобы. Можа быць і пабочны эфект некаторых псіхіятрычных лекавых прэпаратаў — антыдэпрэсантаў. У залежнасці ад таго, што менавіта выклікае названую праблему, прызначаецца і лячэнне. Карысную параду можа даць дантыст.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

**проводит 22 сентября 2009 г. аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

**ЛОТ № 1**

**Капитальное строение (здание аптеки № 113) инв. № 340/С-1893 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание, общей пл. 73,26 кв.м, стены блочные обложены кирпичом, перекрытия – деревянные, год постройки – 1986.

**Местонахождение:** Гомельская область, Лоевский район, дер. Бывальки, ул. Комсомольская, 78.

**Условия использования** – по целевому назначению, или при перепрофилировании для обслуживания жилого дома.

**Земельный участок – 0,0628 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 38 723 343 руб., в т.ч.** имущества – **38 719 243** руб. (снижена на 20 %), право заключения договора аренды земельного участка – **4 100** руб. Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **111 011** руб.

**Задаток, вносимый участником, – 3 500 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Гомельское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 75, тел. (0232) 40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Лоевский районный исполнительный комитет, г. п. Лоев, ул. Ленина, 2, тел. (02347) 4 22 34.

**ЛОТ № 2**

**База РРСУП «Мозырьлесремстрой»: капитальные строения – ремонтно-механические мастерские инв. № 330/С-5942, административное здание инв. № 330/С-5448, склад товарно-материальных ценностей инв. № 330/С-5450, склад горюче-смазочных материалов инв. № 330/С-5453, бытовые помещения инв. № 330/С-5460, мастерские инв. № 330/С-5932, проходная инв. № 330/С-5446, трансформаторная подстанция инв. № 330/С-3128, пилорама инв. № 330/С-5452 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** - административное здание – 2-эт. кирпичное здание, пл. 355,0 кв.м; проходная – 1-эт. кирпичное здание, пл. 59,0 кв.м; мастерские – 1-эт. кирпичное здание, пл. 169,0 кв.м; склад ТМЦ – 1-эт. кирпичное здание; пл. 105 кв.м.; трансформаторная подстанция – 1-эт. кирпичное здание, пл. 41,4 кв.м; склад ГСМ – 1-эт. кирпичное здание, пл. 101,0 кв.м; пилорама – 1-эт. здание, пл. 139,0 кв.м; бытовые помещения – 2-эт. кирпичное здание, пл. 382,1 кв.м; ремонтно-механические мастерские – 1-эт. панельное здание, пл. 2329,0 кв.м; линии электросетей.

**Местонахождение:** Гомельская область, г. Мозырь, пер. Транспортный, д. 3.

**Условия использования** – под производственную базу. Земельный участок 0,1512 га имеет ограничения в использовании, охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ, согласно п.п. 11,13 Правил охраны электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, утвержденных постановлением Совета Министров СССР от 26.03.1984 г. № 255, и Режимом в санитарно-защитных зонах высоковольтных линий, утвержденный главным санитарно-эпидемиологическим управлением Минздрава СССР 28 февраля 1984 г. № 2971-84.

**Земельный участок – 2,8388 га. Срок аренды земельного участка 25 лет.**

**Начальная цена единого предмета аукциона – 763 577 856** рублей, в т.ч. имущества – **520 633 578** рублей (снижена на 20 %), права заключения договора аренды земельного участка – **242 944 278** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **419 296** руб.

**Задаток, вносимый участником, – 70 000 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Государственное опытное лесохозяйственное учреждение «Мозырский опытный лесхоз», тел. (02351) 3 73 37, права заключения договора аренды земельного участка – Мозырский районный исполнительный комитет, тел. (02351) 2 31 88.

**ЛОТ № 3**

**Капитальное строение (здание аптеки № 135) инв. № 340/С-1891 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.**

**Сведения о предмете аукциона:** одноэтажное здание, общей пл. 83,4 кв.м, стены кирпичные облицованы плиткой, перекрытия – деревянные, год постройки – 1980.

**Местонахождение:** Гомельская область, Лоевский район, дер. Переделка, ул. Пионерская, 5.

Условия использования – по целевому назначению или перепрофилирован для обслуживания здания магазина (кафе).

**Земельный участок – 0,1653 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.** Ограничения в использовании – водоохранная зона р. Днепр вне прибрежной полосы.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 17 586 757** руб., в т.ч. имущества – **17 575 967** руб. (снижена на 20 %), право заключения договора аренды земельного участка – **10 790** руб. Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **111 011** руб.

**Задаток, вносимый участником, – 1 500 000 рублей.**

**Продавец:** имущества – Гомельское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 75, тел. (0232) 40 09 94; права заключения договора аренды земельного участка – Лоевский районный исполнительный комитет, г. п. Лоев, ул. Ленина, 2, тел. (02347) 4 22 34.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», **г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны: (0232) 70 14 72, 74 90 27.**

Аукцион проводится **22 сентября 2009 г. в 11.30 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 18 сентября 2009 г.** заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» **№ 3642927330048** в филиале № 300 АСБ «Беларусбанк» г. Гомель, код **МФО 151501661, УНН 400243904.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», **ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням по **18 сентября 2009 г.** включительно.

Заключительная регистрация участников **22 сентября 2009 г. с 10.00 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка, обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: **www.gomel-region.by,** и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: **www.gki.gov.by.**

## У раскладзе руху электрычак — змяненні

**У сувязі з правядзеннем рамонтных работ у расклад руху цягнікоў у найбліжэйшыя дні будуць унесены змяненні.**

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, 4 і 5 жніўня здымаецца электрычка Мінск — Маладзечна адпраўленнем у 13.34. У гэтыя ж два дні адмяняецца і электрацягнік Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 14.58. З 4 па 7 жніўня ўключна электрацягнік Мінск — Маладзечна адпраўленнем у 12.20 будзе рухацца па маршруце Мінск — Уша. У гэтыя ж дні электрычка Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 13.50 будзе рухацца па маршруце Уша — Мінск.

4 і 6 жніўня не будуць курсіраваць электрычкі Мінск, Інстытут культуры — Барысаў адпраўленнем у 12.09 і Барысаў — Мінск-Усходні адпраўленнем у 10.17. Зноў жа, 4 і 6 жніўня электрацягнік Мінск-Усходні — Орша адпраўленнем у 13.13 будзе ісці згодна са зменeным раскладам і прыбываць у Оршу ў 17.02.

З 4 па 7 жніўня ўключна электрычка Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 13.17 будзе рухацца па маршруце Мінск-Пасажырскі — Рудзенск, а Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 13.33 у гэтыя ж дні — па маршруце Рудзенск — Мінск-Пасажырскі.

Толькі 5 жніўня электрацягнік Брэст — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 6.30 будзе прыбываць на станцыю Мінск, Інстытут культуры ў 12.57.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельного участка для индивидуального жилищного строительства:**

**лот 1** — земельный участок в деревне Междуречье, площадь участка — 0,2000 га, кадастровый номер участка 220857111010000051, начальная цена 10 000 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Район новой застройки.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **4 сентября 2009 года** в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **31 августа 2009 года** (включительно) до 17.00 по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36, 8 029 1405437.

**Грамадскае аб'яднанне «Свабоднае слова»** рашэннем агульнага сходу ад 09.08.2008 г. **ліквідуецца**. Прэтэнзіі прымаюцца на працягу двух месяцаў з дня гэтай публікацыі.
**Тэл. 8 029 182 76 57.**

РУП «КОБАЛЬТ» УВЕДОМЛЯЕТ, что тендер на закупку установки (станка) лазерной резки листового металла заявленный с 1 июля по 15 июля 2009 года не состоялся (п. 79 Постановления Совета Министров Республики Беларусь 20 декабря 2008 г. № 198).
Комиссией принято решение о проведении процедуры закупки из одного источника. *УНП 600095395*

**Утерянные** филиалом Белгосстраха по г. Минску **бланки страховых полисов** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу, **формы 2 РН, серии БЛ, № 0644850 и № 0644851, считать недействительными**.

В публикации «Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества» от 29.07.09 г. № 139 **в лоте № 1 читать: начальная цена продажи 12 602 910 руб.**

г. ВИТЕБСК 04 сентября 2009 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ФОНД «ВИТЕБСКОБЛИМУЩЕСТВО», тел. в г. Витебске (0212) 47 60 96

| № лота | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель | Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена объекта | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Докшицкий район, на 88 км автодороги М-3 Минск-Витебск, кадастровый номер 222175200001000040 | Лесные земли площадью 0,1726 га, под дорогами – 0,0719 га | 0,2445 | 50 | Для строительства кафе-гостиницы с подъездной дорогой | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализация древесины, получаемой от вырубки, ГЛХУ «Бегомльский лесхоз» в установленном порядке;<br>- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- заключение победителем аукциона с Докшицким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 34,53 доллара США | 9 520 |
| 2. | Земельный участок расположен по адресу: 32 км (право) автодороги Р-14 Полоцк-Миоры-Браслав в д. Остевичи Заутьевского сельского Совета Миорского района Витебской области, кадастровый номер 223381716101000085 | Земельный участок из земель д. Остевичи площадью 0,3364 га. Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линий электропередачи напряжением до 1000 вольт. | 0,3364 | 55 | Для строительства и обслуживания пункта питания | - заключение победителем аукциона с Миорским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Миорского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 73 020 рублей | 7 302 |
| 3. | Земельный участок расположен по адресу: 73 км (право) автодороги Р-14 Полоцк-Миоры-Браслав в д. Денисово Миорского сельского Совета Миорского района Витебской области, кадастровый номер 223382107501000007 | Земельный участок из земель д. Денисово площадью 0,3162 га. Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Мерица. | 0,3162 | 55 | Для строительства и обслуживания пункта питания | - заключение победителем аукциона с Миорским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Миорского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 434 650 рублей | 43 465 |
| 4. | Земельный участок расположен по адресу: 83 км (лево) автодороги Р-18 граница РФ (Кострово) – Верхнедвинск-Шарковщина-Козяны в д. Чепуки Новопогостского сельского Совета Миорского района Витебской области, кадастровый номер 223383037001000007 | Земельный участок из земель д. Чепуки площадью 0,2808 га. | 0,2808 | 55 | Для строительства и обслуживания пункта питания | - заключение победителем аукциона с Миорским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Миорского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 81 260 рублей | 8 126 |

**АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: Лот № 1 – Витебский областной исполнительный комитет (тел. в г. Докшицы (02157) 2 16 73, 2 05 23); Лоты №№ 2–4 – Миорский районный исполнительный комитет (тел. в г. Миоры (02152) 4 01 04, 4 11 56).**

**1. Аукцион состоится 04 сентября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо подать заявление в фонд «Витебскоблимущество».

**Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителям индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализированную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 31 августа 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 04 сентября 2009 г. с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, местный исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

6. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту); внести плату за право заключения договора аренды земельного участка в долларах США или белорусских рублях по курсу Национального Банка Республики Беларусь на дату платежа; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

8. **Контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты: www.fondgosim.vitebsk.by, www.gki.gov.by, E-mail:votfondgi@tut.by.**

# «РАСПРОДАЖ» КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ!

## Жнівень-верасень будуць самымі «ўдарнымі» месяцамі па продажы кватэр

**Набыццё кватэры — напэўна, адна з самых галоўных пакупак у жыцці кожнага чалавека. І для гэтай галоўнай пакупкі цяпер вельмі спрыяльны час: цэны значна знізіліся. Калі за ўвесь мінулы год кошт мінскіх другасных кватэр знізіўся прыкладна на 4 %, то толькі за І паўгоддзе гэтага — ужо дзесьці на 40 %.**

Пашчасціла тым, хто змог да новага года прадаць сваю нерухомасць. Былыя ўладальнікі «аднапакаёвак», крыху далажыўшы, сталі шчаслівымі гаспадарамі трохпакаёвых кватэр. Калі раней сярэдняя цана за метр другаснай нерухомасці складала каля 1700—2000 долараў ЗША, то сёння кошт прыкладна такі. (Звесткі з аб'яднанай гарадской базы за ліпень.) Аднапакаёўкі: «хрушчоўкі» — 1379 долараў за кв. м (сярэдняя цана — 41,4 тысячы), «брэжнеўкі» — 1385 (каля 45 тысяч долараў), новыя кватэры — 1417 за кв. м (прыкладна 55 тысяч долараў). «Двушкі»: «хрушчоўкі» — 1271 долараў за кв.м. (сярэдняя цана — 55 тысяч), «брэжнеўкі» — 1333 долараў за кв. м (каля 62 тысяч), новыя двухпакаёўкі — 1358 долараў за кв.м (дзесьці 81 тысяча). Трохпакаёвыя кватэры: хрушчоўкі — 1280 долараў за кв.м. (прыкладна 73 тысячы долараў), «брэжнеўкі» — 1330 за кв. м (сярэдняя цана — 81 тысяча), новыя — 1183 долары за «квадрат» (каля 116 тысяч).

Зразумела, лепш за ўсё прадаюцца адна- і двухпакаёвыя кватэры, цяжка — «трошкі», а чатырохпакаёўкі цікавяць пакупнікоў найменш. Добра прадаецца нерухомасць у Серабранцы, Лошыцы, у раёне вуліцы Янкоўскага, праспекта Ракасоўскага. А ўвогуле, хто ў якім раёне прыжыўся, той там і выбірае для сябе новае жыллё.

Мінімальныя цэны на кватэры — у Заводскім раёне, які лічыцца самым ненадзейным у экалагічным плане. Ва Уруччы нерухомасць каштуе крыху больш. Захад, Сухарава, Кунцаўшчына — раёны з яшчэ больш дарагімі кватэрамі. А вось у Маскоўскім, асабліва бліз вуліцы Розы Люксембург, нерухомасць таннейшая. Зусім нядаўна «аднушку» ў гэтых недарагіх раёнах можна было купіць за 30—35 тысяч долараў. Сёння такіх танных кватэр ужо не засталося: усе раскупілі. Цяпер рэальная цана аднапакаёўкі — 40—45 тысяч.

Яшчэ вясной прадаўцы прыглядаліся да сітуацыі, прывыкалі да новых цэнаў на нерухомасць. Цяпер ужо аб'ектыўна ацэньваюць кошт сваёй уласнасці, разумеюць — аднапакаёўку за 60 не варта і выстаўляць, ведаюць, каб прадаць кватэру, патрэбна зніжаць яе цану да рэальнай.

Як адзначаюць спецыялісты рынку нерухомасці, сёння цэны на кватэры зафіксаваліся, спынілі сваё зніжэнне. Некаторыя гаспадары «квадратных метраў», якія не хочуць аддаваць сваю ўласнасць за бясцэнак, вырашылі дачакацца лепшых часоў. Каму ж тэрмінова патрэбна прадаць нерухомасць — засталіся на рынку. Яны рэальна глядзяць на цэны, гатовыя таргавацца і нават, калі знойдзецца пакупнік з «жывымі» грашыма — ідуць насустрач, могуць знізіць цану на 2-5 тысяч долараў ад першапачатковай, каб толькі прадаць сваю нерухомасць. (Праўда, некаторыя прадаўцы жывуць яшчэ меркамі мінулага года і выстаўляюць на продаж свае «аднапакаёўкі» за 70 тысяч і больш.)

— Сёння можна канстатаваць, што апошнія 2-3 месяцы цэны амаль стабільныя: рэзкага зніжэння не назіраецца, — кажа **дырэктар агенцтва нерухомасці «Загарадны дом» Уладзімір ЧАРНУШЭВІЧ**. — Калі і ідзе рэальнае зніжэнне цаны, то канкрэтна пад пакупніка на канкрэтнай кватэры. Каму патрэбна тэрмінова прадаць сваю нерухомасць, той гатовы ісці на ўступкі; каму, як кажуць, не гарыць — трымае цану. Іншымі словамі, рынак стабілізаваўся. А стабільнасць заўсёды выгадная і пакупнікам, і прадаўцам. Яны ведаюць цану, разумеюць, на што можна разлічваць, таму больш упэўнена сябе адчуваюць. Калі ж увесь час на рынку нерухомасці ваганні, нервуюцца і прадаўцы, і пакупнікі. Нават маючы невялікую суму грошай, чалавек наўрад ці рашыцца на пакупку, калі не будзе ўпэўнены ва ўстойлівасці цаны аб'екта, які ён набывае.

Звычайна ліпень — лепшы прадажны месяц года. Людзі, што падумваюць купіць кватэру, прыглядваюцца да сваёй будучай пакупкі яшчэ з вясны, першы месяц лета — час актыўных пошукаў, а ўжо ў ліпені чалавек «саспявае» для набыцця нерухомасці. Гатовыя новабудоўлі таксама лепш прадаюцца ў ліпені і ў кастрычніку.

Але сёлета, напэўна, жнівень-верасень будуць самымі «ўдарнымі» месяцамі па продажы: у сёлетняга сезона ёсць адна асаблівасць, не ўласцівая мінулым гадам, і прычына не толькі ў фінансавым крызісе, які істотна паўплываў на рынак нерухомасці.

— Так склалася, што ў гэтым годзе ў школах — два выпускі, — кажа Уладзімір Георгіевіч. — Шмат іншагародніх учарашніх школьнікаў стане (а некаторыя ўжо сталі) студэнтамі сталічных інстытутаў ці тэхнікумаў. Усіх ахвотных навучальныя ўстановы не змогуць забяспечыць інтэрнатамі. Некаторым давядзецца здымаць жыллё.

Сёння вялікі працэнт іншагародніх бацькоў з-за таннасці нерухомасці гатовыя купіць для сваіх дзяцей кватэру, каб сын ці дачка атрымалі мінскую рэгістрацыю і пасля вучобы размеркаваліся ў сталіцу. Праз пяць гадоў, пакуль дзіця будзе вучыцца і жыць у кватэры, яна падаражэе. Набыццё такой уласнасці — неблагое ўкладанне грошай. Іншагароднія бацькі купляюць, у асноўным, аднапакаёвыя кватэры. А той, хто прадаў гэтую кватэру, дадаўшы грошай, пераязджае ў двухпакаёвую, былы гаспадар «двушкі» — у «трошку»... Іншымі словамі, нерухомасць прадаецца па ланцужку. Змяняюць кватэру на меншую тыя, каму цяжка плаціць камунальныя, тэрмінова патрэбны грошы на нейкія свае мэты. Некаторыя бяруць крэдыты на спажывецкія патрэбы, прадаюць сваю нерухомасць і купляюць кватэры большай плошчы. Рынак ажывіўся. Але гэта асаблівасць сёлетняга сезона.

— У студзені-лютым-сакавіку вельмі адчувалася, што рынак стаіць, — працягвае дырэктар агенцтва нерухомасці. — А сёння за кошт «іншагародніх» грошай адбыўся штуршок. Думаю, такая тэндэнцыя захаваецца да новага года. Потым зноў чакаецца зацішша. Зімой, звычайна, і ў добрыя гады, да крызісу, на рынку нерухомасці быў штыль. У гэты час у людзей менш грошай: за лета-восень, у час водпуску, яны добра трацяцца.

Што будзе з цаной на кватэры далей, па прагнозах спецыялістаў, залежыць і ад забудоўшчыкаў новага жылля. Калі яны якім-небудзь чынам змогуць патанніць свае затраты на будаўніцтва і прапануюць кватэры, скажам, па 800 долараў за «квадрат», тады адгукнецца і папаўзе ўніз цана і на б/к жыллё.

— Пакуль ідзе тэндэнцыя «ў мінус»: нерухомасць таннее. Многія пытаюцца, калі ж будзе «дно». Мяркую, тое самае «дно» будзе ўжо ў студзені-лютым гэтага года, — прагназуе Уладзімір Чарнушэвіч. — Тады чакаецца самы пік зніжэння цэнаў. Пасля гэтага попыт і дэфіцыт прапаноў выклічуць павольны, але рост. Таму чалавеку, які хоча прадаць сваю нерухомасць, лепш рабіць гэта цяпер. А пакупнікам, калі кватэра патрэбна тэрмінова, таксама не мае сэнсу цягнуць з пакупкай, бо хутка такога выбару ўжо не будзе. Каму ж «не гарыць» — лепш дачакацца зімы. Праўда, існуе верагоднасць, што тады ўжо давядзецца задавольвацца тым, што засталося, напэўна, не самым лепшым.

Прадавец і пакупнік — гэта заўсёды супрацьлеглыя бакі, адзін хоча даражэй прадаць, а другі — танней купіць. Калі ўладальнік знаходзіць ахвотніка купіць яго нерухомасць, то адразу згодны на ўсе ўмовы, а пасля атрымання грошай здаралася, што некаторыя былыя гаспадары нават ручкі з дзвярэй выкручвалі, каб нічога лішняга не пакінуць ва ўжо не сваёй уласнасці. Для людзей, якія сутыкаюцца з набыццём кватэры ўпершыню, складанасці могуць выклікаць самыя простыя, на першы погляд, рэчы: калі перадаваць грошы, як упэўніцца ў іх сапраўднасці. Калі ёсць пасярэднік паміж пакупніком і прадаўцом, які адлюструе ўсе пажаданні і патрабаванні абодвух бакоў на паперы ў выглядзе дагавора, становіцца прасцей. Да таго ж страхавы поліс, у выпадку судовай спрэчкі, застрахуе чалавека і пакрые яго расходы, калі здзелка будзе прызнана несапраўднай.

— Калі мы правяраем кватэру для продажу, напэўна, баімся дзесьці памыліцца больш за кліентаў, — прызнаецца дырэктар агенцтва нерухомасці. — У выпадку памылкі з нашага боку, страхавы поліс пакрые суму грамадзяніну, а страхавая арганізацыя прад'явіць рэгрэсны іск нам за тое, што мы не належным чынам правялі праверку дакументаў, не вывучылі гісторыю кватэры. Людзі, калі набываюць жыллё, хочуць быць спакойнымі, ведаць, што кватэра «чыстая», ніхто на яе не будзе прэтэндаваць. І агенцтва гэта гарантуе. У нас прыкладна два разы на тыдзень купляюць нерухомасць расіяне. Патрэбна бачыць, як яны вычытваюць дагаворы, стараюцца не прапусціць ні адной літары, слова. У іх паталагічны страх застацца без грошай і кватэры. Нашы беларусы ў гэтым плане спакойныя, яны ведаюць, што на рынку жорсткі парадак, іх не падмануць.

Што ні кажы, але цяпер вельмі цяжка купіць ці пабудаваць кватэру без дапамогі крэдытаў. Яшчэ нядаўна грошы на будаўніцтва і пакупку нерухомасці выдавалі восем беларускіх банкаў: Беларусбанк , Белгазпрамбанк, Белінвестбанк, Белрасбанк, БПС-Банк, Пріорбанк, Белзнешэканамбанк, Парытэтбанк. Сёння сітуацыя крышку змянілася. Як вядома, з 28 ліпеня да 1 студзеня 2011 года беларускія банкі не будуць выдаваць крэдытаў фізічным асобам у замежнай валюце. У сувязі з гэтым тры з вышэйпералічаных банкаў — Белгазпрамбанк, Пріорбанк і Белрасбанк — часова спынілі выдачу грашовых сродкаў на набыццё і будаўніцтва жылля. У Белрасбанку расказалі, што цяпер выдаюць толькі спажывецкія крэдыты, распрацоўваецца аўтакрэдытаванне, а даваць грошы на нерухомасць у найбліжэйшы час не плануецца.

Белзнешэканамбанк выдае крэдыты на нерухомасць толькі на агульных умовах, пад 26 працэнтаў гадавых. У Беларусбанку, Белінвестбанку і БПС-Банку, акрамя крэдыту на агульных умовах, грошы могуць атрымаць і тыя, каму патрэбна паляпшэнне жыллёвых умоў: пад 17 працэнтаў гадавых ад 70 да 80 працэнтаў ад агульнага кошту кватэры. Сума крэдыту залежыць ад даходу крэдытаатрымальніка. Парытэтбанк крэдытуе толькі пярвічны рынак (новыя кватэры) пад 18 працэнтаў гадавых да 70 працэнтаў ад агульнага кошту нерухомасці. Белінвестбанк, калі дазваляе даход, можа пракрэдытаваць да 80 працэнтаў ад агульнага кошту жылля, Беларусбанк — да 75 працэнтаў.

БПС-Банк чалавека, які стаяў на ўліку па паляпшэнні жыллёвых умоў не менш за пяць гадоў, можа пракрэдытаваць да 70 працэнтаў ад агульнага кошту нерухомасці. Астатнія могуць разлічваць толькі на тое, што пракрэдытуецца 15 кв. метраў на аднаго чалавека. У кожным канкрэтным выпадку вылічваецца індывідуальная сума крэдыту.

Акрамя таго, Нацыянальны банк да канца года збіраецца знізіць стаўку рэфінансавання з 14 да 12 працэнтаў, а значыць — стануць больш даступныя і крэдыты.

Мая знаёмая, каб купіць кватэру, у жніўні мінулага года ўзяла крэдыт у Белрасбанку. Аднапакаёўка, якую яна хацела купіць, каштавала тады 67 тысяч долараў. Банк даваў крэдыт у замежнай валюце на 15—20 гадоў пад 12 працэнтаў гадавых да 90 працэнтаў ад агул ьнага кошту жылля. Жанчына скарысталася такім крэдытам, бо ўласных зберажэнняў у яе было не больш за 10 тысяч долараў. Праз пару месяцаў, як вядома, кватэры вельмі патаннелі, а долар пасля новага года стаў каштаваць больш. У выніку цяпер мая знаёмая кожны месяц плаціць 622 долары па крэдыце, што складае больш за яе зарплату. Жывуць на заробак мужа. Жанчына расказала, што даволі шмат людзей з яе работы таксама купілі кватэры, якія потым вельмі і вельмі патаннелі. Што будзе далей і як жыць, калі напрыклад, скароціцца зарплата мужа, мая знаёмая нават не ўяўляе, як і тыя людзі, якім не пашчасціла купіць такія дарагія кватэры.

**Марына ЛЯВОШКА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ая лічу так

# ШТУЧНЫ АЖЫЯТАЖ АДМЯНЯЕЦЦА

## НЕВЯЛІКАЕ ПАВЕЛІЧЭННЕ ПОПЫТУ НА СТАЛІЧНЫЯ КВАТЭРЫ ЗАПЛАНАВАНА НА ПАЧАТАК ВЕРАСНЯ

**Такую думку выказаў карэспандэнту «Звязды» старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ. Ужо традыцыйна лета з'яўляецца сапраўды «мёртвым» сезонам на другасным рынку жыллёвай нерухомасці, калі патэнцыяльныя пакупнікі ў гэты час амаль не цікавяцца гатовым жыллём. Не стала выключэннем і сёлетняе лета, бо, паводле інфармацыі агенцтваў нерухомасці асацыяцыі, колькасць рэальных здзелак па продажы кватэр на другасным рынку сталічнага жылля ў ліпені была істотна меншая, чым у маі.**

Эксперт другаснага рынку нерухомасці Мікалай Прасталупаў упэўнены, што мінімум да пачатку трэцяй дэкады жніўня сталічныя агенцтвы будуць загружаны мінімальна. Да гэтага часу цэны на кватэры будуць заставацца на сённяшнім мінімальным узроўні, ці нават крыху знізяцца. Нейкай пэўнай актывізацыі патэнцыяльных пакупнікоў кватэр трэба чакаць толькі пасля 20 жніўня — сярэдзіны верасня, калі з адпачынкаў пачне вяртацца асноўная колькасць жыхароў Мінска.

Сёння сярэдні кошт квадратнага метра жылля агульнай плошчы аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр складае каля 1400 долараў, але, пры рэальных здзелках пакупнікамі купляецца толькі такое жыллё, калі жыллёвы квадрат прапануецца па кошце 1200—1300 долараў. Трохпакаёўкі і іншыя шматпакаёвыя кватэры цяпер увогуле амаль не карыстаюцца попытам, таму па гэтым сегменце жылля квадратны метр таннее часам да 1100—1200 долараў. У апошнія дні ліпеня, напрыклад, без праблем магчыма было набыць не вельмі якасныя аднапакаёвыя кватэры па 37—39 тысяч долараў. А ўжо па кошце 40—42 тысячы долараў на рынку існуе значна большы выбар невялікіх кватэр. Існуюць на рынку і танныя двухпакаёвыя «хрушчоўкі», якія выстаўляюцца часам за 48—50 тысяч долараў, а стандартныя «двушкі» ў дзевяціпавярховых дамах каштуюць мінімум 52—55 тысяч долараў. Мінімальны кошт трохпакаёвых кватэр сёння складае ад 65 тысяч долараў, але сустракаюцца невялікія «хрушчоўкі» з сумежнымі пакоямі і маленькай агульнай плошчай усяго толькі за 60—63 тысячы долараў. Прагназаваць, як будзе паводзіць сябе цэннік на кватэры на другасным рынку жылля зараз цяжкавата. Спецыялісты асацыяцыі разглядалі тры магчымыя варыянты развіцця падзей.

Калі на жыллёвым рынку і ў банкаўскай сферы нічога кардынальнага не адбудзецца, то ў найбліжэйшыя 6 месяцаў працягнецца вельмі марудная, не больш 1—5 %, далейшае патанненне кватэр. Другі сцэнарый прадугледжвае тое, што ў Мінску пачнуць даволі хутка і шмат будаваць танныя панэльныя дамы, а з другога боку крэдыты пад набыццё кватэр будуць заставацца вельмі дарагімі. У гэтым выпадку эксперты прагназуюць, што кватэры на другасным рынку жылля могуць патаннець значна мацней. Асобныя спецыялісты нават называюць канкрэтныя лічбы, калі па такім сцэнарыі пасля новага года квадратны метр агульнай плошчы кватэр можа патаннець да 900—1000 долараў. Згодна з трэцім варыянтам, прыватныя забудоўшчыкі па лініі долевага будаўніцтва могуць мець пэўныя цяжкасці з пошукам кліентаў з грашыма, а таму пачнуць масава згортваць сваю дзейнасць на тэрыторыі сталіцы. А вось калі ў Мінску аб'ём будаўніцтва новага жылля паменшыцца, а крэдыты пад куплю кватэр патаннеюць, то цэны на сталічную жыллёвую нерухомасць могуць нават павялічвацца.

Цяпер большасць спецыялістаў рэальна разглядае толькі два першыя варыянты, бо з крэдытамі ў нас пакуль усё туманна. Што датычыцца долевага будаўніцтва, то тут кліентаў пачалі шукаць вельмі актыўна. Сёння квадратны метр будучага жылля па лініі долевага будаўніцтва прапануецца людзям амаль па сабекошце будаўніцтва: ад 900 да 1300 долараў. Ніжэйшая мяжа гэтага кошту складае 750—800 долараў, потым будтрэсты пачнуць працаваць без прыбытку...

### АЛГАРЫТМ СУМНЕЎНЫХ ПРАГНОЗАЎ І ПАРАД

*Калі другасны рынак сталічнай нерухомасці амаль замерз, то яго трэба нейкім чынам разварушыць. Напрыклад, асобныя кіраўнікі агенцтваў нерухомасці пужаюць гаспадароў кватэр далейшым патанненнем жылля, і таму раяць ім хуценька прадаваць сваю нерухомасць. А з другога боку, пакупнікам прапануецца не цягнуць з пакупкай, бо хутка такога выбару ўжо не будзе. Менавіта такім чынам вешчуны ад рынку нерухомасці лабіруюць інтарэсы свайго бізнэсу: прыцягваюць увагу багатых людзей да свайго тавару, а ўладальнікаў кватэр падштурхоўваюць прадаваць свае квадратныя метры за капейкі.*

*Так і цяпер, асобныя прагназісты прадказваюць ажыятажны «распродаж» ужо ў жніўні. З чаго ён узнікне, невядома. Танных крэдытаў на набыццё кватэр банкі не прапануюць. Заробкі грамадзян за апошнія 7 месяцаў істотна не павялічыліся. З чаго ўзяцца гэтаму ажыятажу? Яго можна толькі прыдумаць.*

*Парада аб тым, што менавіта цяпер трэба набываць жыллё на другасным рынку, здаецца сумнеўнай. Начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Мінбудархітэктуры Аляксандр ГОРВАЛЬ, напрыклад, упэўнены, што бескватэрным «чаргавікам» было б больш мэтазгодным будаваць новае жыллё па лініі долевага будаўніцтва. Дольнікам сёння прапануецца новае сучаснае жыллё па цэнах ніжэйшых, чым на другасным рынку. Людзі і з уласным жыллём і з лішнімі грашыма таксама не спяшаюцца ўкладваць свае грошы ў старыя кватэры (калі гэта не датычыцца сапраўды ліквідных месцаў горада і цэнтра), а, хутчэй, набываюць новыя «квадраты» на кватэрных аўкцыёнах. Між іншым, вопыт мінулых аўкцыёнаў паказаў, што попыт на гатовыя кватэры ў новых дамах застаецца на стабільна мінімальным узроўні. Кошт кватэр на такіх аўкцыёнах не ўздымаўся вышэй чым 1000—1200 долараў за квадратны метр. Асобныя кватэры з вялікай плошчай на аўкцыёнах так і не былі прададзены.*

*Можа сёння трэба хутчэй прадаваць сваё жыллё, бо заўтра яно яшчэ патаннее? Сур'ёзныя ўдзельнікі рынку нерухомасці і тут не раяць моцна спяшацца. Цяпер кватэры ўжо істотна патаннелі і цэны на іх часова стабілізаваліся. Мэтазгодным лічыцца прадаваць жыллё толькі ў тым выпадку, калі адшукаецца паралельна варыянт па адначасовым набыцці другой кватэры, напрыклад, большай плошчы. Нядрэнным можа стаць варыянт, калі прадаецца старая маленькая кватэра бліжэй да цэнтра, а набываецца больш прасторнае жыллё ў сучасным доме новага мікрараёна. А вось проста прадаць кватэру, каб пакласці грошы ў кішэню і чакаць лепшых часоў... Такая аперацыя, мне здаецца, была б, сама меней, глупствам.*

**Сяргей КУРКАЧ.**


# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 8 сентября 2009 г. проводит открытый аукцион № 03-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 18 земельных участков для строительства в г. Минске:

| Лот № | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | S, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | микрорайон Каменная горка-5 | 500000000006004518 | 0,4466 | Предприятие торговли продовольственными товарами общественного питания (по генплану № 65) | 318 106 575 | 28 629 590 | 3 783 368 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 425 584 бел. руб. |
| 2 | микрорайон Каменная горка-5 | 500000000006004520 | 0,3119 | Магазин продовольственных товаров (по генплану № 66) | 222 160 950 | 19 994 490 | 3 675 858 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 287 222 бел. руб. |
| 3 | ул. Шабаны (микрорайон Шабаны-1) | 500000000002004721 | 0,4793 | ФОК с объектами общественного питания и сопутствующей торговли | 269 816 025 | 24 283 440 | 3 186 247 | – |
| 4 | микрорайон Ангарская-2 | 500000000002004971 | 0,2517 | ФОК и развлекательный комплекс с объектами общественного питания и сопутствующей торговли (по генплану № № 71, 72) | 182 656 050 | 16 439 040 | 3 161 667 | – |
| 5 | микрорайон Малиновка-5 | 500000000005004299 | 0,6905 | ФОК с объектами общественного питания и сопутствующей торговли (по генплану № 20) | 460 103 325 | 41 409 300 | 4 353 945 | – |
| 6 | ул. Янковского (микрорайон Сухарево-7) | 500000000006004110 | 0,2445 | ФО и развлекательный комплекс с крытым плавательным бассейном, объектами общественного питания и торговли | 179 303 850 | 16 137 350 | 3 138 838 | – |
| 7 | Слепянская водная система от ул. Плеханова до ул. Малинина | 500000000003002923 | 0,2378 | ФОК с сопутствующими объектами общественного итания, торговли и обслуживания населения в составе объекта «Лыжероллерная трасса в составе Слепянской водной системы от ул. Плеханова до ул. Малинина» | 169 838 325 | 15 285 450 | 7 027 916 | возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 10 346 800 бел. руб. |
| 8 | парк им. Челюскинцев | 500000000009003413 | 0,2157 | Крытый каток с объектами общественного обслуживания, питания и сопутствующей торговли (по генплану № 17) | 162 726 000 | 14 645 340 | 2 989 349 | – |
| 9 | ул. Скрипникова – ул. Одинцова (микрорайон Красный Бор-II) | 500000000006004385 | 0,5496 | Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения (по генплану № 87) | 386 446 500 | 34 780 190 | 2 387 675 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 8 642 390 бел. руб. |
| 10 | ул. Скрипникова – ул. Одинцова (микрорайон Красный Бор-II) | 500000000006004384 | 0,4863 | Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения (по генплану № 85) | 341 938 275 | 30 774 450 | 2 387 675 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 7 647 000 бел. руб. |
| 11 | ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемая | 500000000006004117 | 1,9073 | Многоуровневая автостоянка на 900 м/м с сервисным центром, объектами торгового и общественного назначения (по генплану № 14) | 1 368 596 700 | 123 173 700 | 5 614 250 | возмещение убытков ОАО «Мапид» в размере 121 539 450 бел. руб. |
| 12 | ул. Матусевича (микрорайон Масюковщина-3) | 500000000006004109 | 0,3754 | Крытые теннисные корты с помещениями общественного питания и физкультурно-оздоровительного обслуживания населения | 263 799 825 | 23 741 980 | 2 900 912 | – |
| 13 | ул. Рябиновая – ул. Проектируемая № 1 (жилой район Сокол) | 500000000004002968 | 2,1987 | Малоэтажная (1-3 эт.) застройка | 1 065 119 925 | 95 860 790 | 3 949 186 | – |
| 14 | пр. Дзержинского | 500000000005005087 | 2,6082 | Многофункциональный торговый и культурно-развлекательный комплекс в составе студенческого жилого комплекса (по генплану № 1, № 7) | 1 942 685 925 | 174 841 730 | 3 115 029 | возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 99 080 360 бел. руб. |
| 15 | пр. Дзержинского | 500000000005005086 | 1,7401 | Физкультурно-оздоровительный комплекс с бассейном и мини-аквапарком в составе комплекса «Студенческая деревня» (по генплану № 16) | 1 296 091 500 | 116 648 240 | 2 771 447 | возмещение потерь сельскохозяйственного производства, а также затрат ГПО «Горремавтодор Мингорисполкома» в сумме 168 446 799 бел. руб. |
| 16 | зона отдыха водохранилища «Комсомольское озеро» (парк Победы)» | 500000000007004962 | 0,4998 | Парковый историко-туристический центр (по генплану № 160) согласно архитектурному проекту «Реконструкция зоны отдыха водохранилища «Комсомольское озеро» (парка Победы)» | 480 410 775 | 43 236 970 | 2 790 422 | – |
| 17 | пр. Дзержинского в микрорайоне Малиновка-1 | 500000000005005101 | 0,2594 | Объект общественного питания | 191 225 250 | 17 210 270 | 3 031 279 | – |
| 18 | ул. Селицкого – ул. Шабаны | 500000000002007012 | 0,321 | Обьект общественного питания типа «Лидо» (№ 44 по генплану) | 163 491 900 | 14 714 270 | 2 443 973 | – |

Земельные участки свободны от застройки. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **8 сентября 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

внести задаток в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **10.00 4 августа 2009 года** и заканчивается в **17.00 2 сентября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № № 4, 6.

**Контактные телефоны + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация** о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов **www.mgcn.by.**

**Простая мова**

# СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Што было — было: да знаёмай госці з Расіі прыехалі, на вакзале сустрэла, пасадзіла ў таксоўку, дадому вязе. А тыя ў новым месцы, ну, безумоўна ж, галовамі круцяць, усё разглядаюць, пра нешта пытаюцца... Рэклама вось на вочы патрапіла — з кідкім «Лепшыя фарбы ў горадзе!».**

**— Что такое «лепшыя»? — тут жа спыталі замежнікі.**

**— «Лучшие», — пераклала мінчанка. — А «фарбы» — это панашему «краски»...**

**І змоўкла, бо трэцяе слова, як ёй падалося, у перакладзе патрэбы не мае — і так зразумеюць.**

**Ніколі не здагадалася б ШТО (канкрэтна яны зразумеюць), — госць «падказаў», калі праз паўзу выдаў: ну вось табе, маўляў, і хвалёныя беларусы.... Раструбілі на ўвесь свет пра сваю гасціннасць, пра сваю талерантнасць... У іх, бачыце, усе веравызнанні ў пашане, усе нацыі... А што ж насамрэч? Гэты каўказец, Гарадзе, прадае ім лепшыя фарбы, а яны яго прозвішча з маленькай літары пішуць!..**

**Пішаш — і сапраўды — адно. А хто што прачытае...**

## Лавачка. Ды не тая!

Правіла жыцця: унучку любіш болей, чым дачку.

А тым больш, калі яна, ну гэта ўнучачка, усяго адна. І так доўга чаканая! І ў гонар бабулі названая! І самою ёй гадаваная... Тут душу, здаецца, аддаў бы, а ўжо хату... Ды пагатоў!

Хай і цяжка яна будавалася — з мужыком удваіх бярвенні цягалі, хоць і дорага каштавала (на будоўлі духі муж сарваў і памёр), а з сабой, на той свет, яе не пацягнеш...

Бабуля дароўную на ўнучку аформіла — чын па чыну ўсё, афіцыйна.

І тая, як быццам, удзячнай была! Прынамсі, восенню старэнькую да сябе забрала — у гарадской кватэры з усімі выгодамі пакойчык адвяла. Толькі жыві, здавалася б! Ды каб на лета яшчэ і дадому...

Дык не ж: туды яе маладыя (унучачка з мужам) панатралі, сваю (?!) нерухомасць рашылі ў парадак прывесці, еўрапейскі рамонт зрабіць: новыя вокны паставілі, перагародкі-печы вон павыкідвалі, бабулін «хлам» увесь чыста — таксама. Сад стары яе высеклі, на гародзе газон пасеялі...

Ездзяць цяпер (па сакрэце плачацца старая) і самі, і з сябрамі — гарэлку ды віно сабе п'юць, у розныя гулі гуляюць, «мяса на прутках нейкіх паляць».

Ёй там месца няма — у Мінску сядзіць. Дзень пры дні. Ля пад'езда, на лавачцы.

## З кім павядзешся...

Ад Бога, кажуць, прафесія адна — Настаўнік. Усе астатнія — ад настаўніка.

...Ліст. Афіцыйны (гэта значыць, на спецыяльным бланку, з круглай пячаткай, з подпісам). У першым жа радку пазначана, каму: «Редакции газеты «Звезда».

Варты цытавання і змест: «Администрация СШ №... (важны не столькі ён... — **Аўт.**) просит рассмотреть и принять к печати заметку учащейся 9А класса... Галины...»

І далей — пра тое, што яна, гэтая Галіна Б., «обучается» выключна на 9-10 па ўсіх прадметах, «в этом году... заканчивает базовую школу и готовится получить свидетельство о базовом образовании с отличием. За время учебы показала себя грамотной, всесторонне развитой ученицей, имеющей по всем предметам похвальные отзывы учителей..., активной участницей фольклорного ансамбля... Кроме того... Галина увлекается историей Беларуси и ведет поисковую работу. Под руководством учителя истории... и в соавторстве с подругой... (прозвішчы называюцца. — **Аўт.**) написала работу... посвященную братьям Тышкевичам, которые организовали первый белорусский музей в Логойском районе.»...

З ёй, з гэтай працай, паведамляецца далей, дзяўчынка збіраецца выступіць на навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў раёна. Яе ж, гэтую працу, напісаную яўна не дзіцячай рукой і па-руску, адміністацыя школы прапануе чытачам «Звезды», а папярэдне — просіць рэдакцыю «уведомить, будет ли принят материал к печати». Напрыканцы, як прынята ў людзей дзелавых — нумары кантактных тэлефонаў: дырэктара школы, яго намесніка, настаўніка гісторыі і ўжо зусім нечаканае: «Рады сотрудничать с вами!».

Што ж мы?

Каюся: знямеўшы ад халоднага подыху так даўно, здавалася, прамінулых часоў, досыць доўга маўчалі — проста не маглі пазваніць: не ведалі, як, якімі словамі сказаць гэтым, без сумневу, адукаваным сталічным дамам, што няма ў нашай краіне газеты «Звезда», ёсць — «Звязда», што гэта — амаль стогадовая (!) беларуская і беларускамоўная газета, што яе імем у Мінску названы праспект...

А галоўнае, што нейкую нататку для яе (ці нават вялікі артыкул) ва ўсе часы, а сёння — і тым больш, вольны напісаць любы чалавек, незалежна ад узросту, адукацыі і адзнак у дзённіку, што падставай для публікацыі з'яўляецца актуальнасць тэмы і зместу, а не хадайніцтвы яго, так бы мовіць, настаўнікаў ці начальнікаў...

Калі ж такі пазванілі і паспрабавалі неяк давесці, слухалі, здаецца, уважліва. А вось ці зразумелі (і што, канкрэтна?) — не ведаю. Факт, што нататку пра братоў, якія стварылі музей, напісаную без «руководства учителя», Галіна Б., якая «увлекается историей Беларуси и ведет поисковую работу» ў рэдакцыю «Звязды» так і не прыслала.

А шкада — і яе, і тых братоў...

Ды больш за ўсё — шкада настаўнікаў. Падобна, забюракрачаных і затурканых (ці прабачацца гэтыя словы?) зараз настолькі, што ўжо, здаецца, і забыліся, дзе яны жывуць і калі...

Ад Бога, кажуць, адна прафесія...

## Далёкае — блізкае

Праверана: *чужая* хата, *чужая* вёска, горад, краіна, пакуль не пераступіш парог, не пераедзеш мяжу... Чужы і чалавек пакуль не перакінешся нейкім словам. Потым — адносіны ўжо мяняюцца. На якія?

...Не памятаю, хто адчуў-зразумеў гэта першым, хто, «из дальних странствий возвратясь» першым напісаў, што «Болгария (умоўна) становится ближе»... Але адкрыццё гэта прыжылося, пайшло ў народ, для якога ў апошнія гады куды бліжэйшымі сталі дзясяткі краін — Польшча, Румынія, Чэхія, Турцыя, Ізраіль... Краін, куды, маючы грошы, можна паехаць, каб, як правіла, добра адпачыць, краін, адкуль да нас валам пайшлі тавары...

У нашу краму вясной з Ірана сушаны вінаград прывезлі. Купіла, прынесла дамоў, у вольную хвілінку хацела перабраць і амаль адразу ж заўважыла, што патрэбы ў гэтым няма — чыстыя разынкі... Нават ад пладаножак!

Здзівілася, запаважала людзей і цяпер міжволі сачу за тамтэйшымі навінамі, міжволі хвалююся...

Межы і адлегласці паміж краінамі. Межы і адлегласці між людзьмі. Пакуль не пераедзеш, пакуль не пераступіш нейкія парогі, пакуль не перакінешся словам...

Ці нешта не купіш... Зробленае з любоўю.

## На вадзе...

У Міхайлаўны «дзіцятка» адно — сын (і дужа ўлюбёны!), унучачак — дзве. Яшчэ б, здавалася, хлапчука...

Пра яго, аднак, думак няма — цяжкія часы: дай Бог гэтых на ногі паставіць... З дапамогай дзядоў ды бабуль.

Што цікава — адна з іх (тая самая Міхайлаўна) — 65 вясной адзначыла. Гэта значыць, што нарадзілася яна ў 1944-м, тут, у Беларусі — лічы, спаленай, лічы, знішчанай. І ў сям'і сваёй была... пятай.

За святочным сталом мы памянулі бацькоў яе, гора хапіўшых напоўніцу.

І падзякавалі ім — у прыватнасці за тое, што яны тады не займаліся планаваннем сям'і, не падлічвалі, што дадуць сваім дзецям. Жылі паводле показкі «лішні кубак вады ў гаршку, і дзіцятка падгадуецца».

Што дзіўна цяпер, яно, гэтае дзіцятка (дакладней — яны, цэлыя пакаленні дзяцей) сапраўды гадаваліся!

Што яшчэ «дзіўней» — выраслі (на вадзе, на бядзе!) у годных, прыгожых людзей. Да якіх, часам вельмі далёка тым, хто рос у раскошы.

## Не пра пазлы

Дом гэты — доўгі, сагнуты падковаю — на бойкім скрыжаванні паставілі. Дакладней — крыху паводдаль ад яго, на пагорачку. Усе подступы «пазламі» выклалі — моднай цяпер невялікай пліткаю. Ды ў два колеры... Карпатлівая гэта работа, а ўжо марудная: месяцы са два, калі памяць не падводзіць, брыгада мужчын шчыравала, на каленьках поўзала, пакуль справу зрабіла. Досыць прыгожа атрымалася. Шкада толькі, што... нядоўга пабыло: адным пагодным дзяньком тыя ці не тыя мужчыны зноў на пляцоўцы з'явіліся і памаленьку, па адной, тыя «пазліны» сталі вымаць-выкалупваць, складваць у «стосы». Не стрымалася (на пяты дзень), спытала, што ж гэта робіцца і навошта?

— Надо, — строга патлумачыў адзін з мужчын, — подземный переход здесь будет... На все четыре стороны! Видите ж сколько машин?

«Вижу», у сэнсе — бачу: машын і насамрэч шмат — пераход, падземны, патрэбен. Але ж ідэя будаўніцтва яго з'явілася, мусіць, не ўчора? Тады навошта было ўкладваць плітку — рыхтаваць пад яе «падушку», літаральна — гарбаціцца, поўзаючы на каленьках, паштучна масціць? Каб праз год-другі разбурыць?

— ...Затое беспрацоўя ніколі не будзе, — бы падслухаўшы думкі, суцешыў нехта з мінакоў. Гэта ж добра, маўляў.

...Дрэнна, што грошай у нашай казне таксама не будзе.

## Сярод добрых людзей

...Таполі, відаць, былі старымі, трухлявымі? Ці вецер замоцным? Асобныя ён вывернуў з каранямі, а ўжо што паламаў!.. Не прайсці было... Пакуль не прыехалі нейкія дзядзькі з піламі, не парэзалі дрэвы на дровы, не паскідвалі ў кузаў машыны, некуды не звезлі: ад прысады толькі пні засталіся — зрэдзь дзе... Шкадобнае відовішча.

Але было, бо ў хуткасці знайшліся добрыя людзі — у пнях, што бліжэй да іх хат, нарабілі ямаў, панасыпалі зямлі і насадзілі кветак — аксамітак, петуній. Ды яркіх прыгожых!

Кожны пень у выніку і не пень быццам стаў — цуд! Альбо твор мастацтва!

...Яно, выходзіць, здараецца, яно можа пашанцаваць — нават пню — сярод добрых людзей.

**Валянціна ДОЎНАР.**

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 15 (615)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❒ Зруб памер 5х5 м, у камплекце ўся кроквенная сістэма, цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 01772 53 926, 8 029 550 39 28.

❒ Дом 108 кв. м у в. Прудніки Мядзельскага раёна, участак 14 сотак. Паблізу рака. Тэл. 8 01797 43 522.

❒ Дом з гаспадарчымі пабудовамі 1,5 км ад чыгункі.
Тэл. 8 01797 43 529.

❒ Дом у в. Забалоцце Браслаўскага р-на з г/пабудовамі, можна пад знос. Тэл. 8 029 548 72 41.

❒ Акардыён «Вельтмайстар» і «Хорх» 11 рэгістраў, поўны, выдатны стан. Тэл. 8 02152 37 333.

❒ Эл. пліта і газавая пліта брэсцкая, новая. Тэл.: 8 029 115 56 99, 8 017 295 96 84.

❒ Гараж са склепам у г. Мінску па вул. Някрасава, $12 000, торг.
Тэл. 8 029 778 56 17.

❒ Матацыкл «ІЖ», лодка 1-месная металічная, плуг 1-карпусны.

❒ Звяртацца: 222451, вул. Зарэчная, 2, в. Любань Вілейскага р-на.

❒ Козачка зааненскай пароды (4 месяцы).Тэл.: 8 02137 39 154, 8 033 308 68 02.

❒ Воз на гумавым хаду, вупраж. Тэл. 8 01777 44 356.

❒ Кабан жывой вагой, задні мост да Т-40.
Тэл. МТС 631 65 19.

❒ Трактар Т-25.
Тэл. 8 029 241 05 77.

❒ VW-Пасат-В-4, 1994 г.в. 1,9 ТД, седан, эл. люк, фаркоп, ц/замок, літыя дыскі, выдатны стан.
Тэл. 8 029 939 34 81.

❒ Прычэп трактарны 2-восевы, плуг новы без рамы 2-карпусны.
Тэл. 8 01632 47 319.

❒ «Опель-Зафіра» 2001 г.в. 2,0 ТД, маецца ўсё. Тэл.: 8 029 574 14 88, 8 029 928 99 88.

❒ Пярэдні вядучы мост да Т-40, з дыскамі, $200 у.а.
Тэл. 8 029 516 22 54.

❒ Дэталі трансмісіі, рэверс да Т-40А, НШ10, НШ32, шарніры, крыжавіны.
Тэл. 8 02135 27 914.

❒ Млын 380 в, 5,5 кВт, прычэп да матаблока МТЗ-0,5, новы.
Тэл. 8 029 133 97 24.

❒ Каляска інвалідная (г. Барысаў). Тэл.: 8 01777 97 871, 8 044 754 06 65.

❒ Касілка навясная КН-1 да трактара МТЗ-05, новая, танна.
Тэл. 8 01792 54 453.

***КУПЛЮ***

❒ Дамок (дачу) да 80 км ад МКАД (г. Мінска) прыватызаваны, з вадой, электрычнасцю.
Тэл.: 8 029 672 01 97, 626 97 34.

***РОЗНАЕ***

❒ Мяняю прыватызаваную 3-пакаёвую кватэру ў г. Хойнікі на 2-, 3-пакаёвую ў г. Гомелі.
Тэл.: 8 029 366 99 57, 8 02346 30 491.

Падрыхтоўка да ЦТ па бел. мове, пераклад з польскай, карэктура. Тэл. 8 017 294 13 38.

**ЗВЯЗДА**

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №__________ Выдадзены ______________________________

Подпіс ________________ Дата _________

***В дополнение к объявлению, опубликованному в номере от 18 июля 2009 г. № 132 газеты «Звязда» вносим изменения в повестку дня собрания ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»:***

**Повестка дня собрания:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за второй квартал и первое полугодие 2009 года и основные направления его развития на 2009 год. Информация об итогах льготной продажи и обмена на ИПЧ «Имущество» работникам Общества акций, принадлежащих государству.
*Докладчик — директор Общества.*
2. О направлениях использования чистой прибыли на 2009 год и первый квартал 2010 года, размере и сроке выплаты дивидендов за 2009 год.
*Докладчик — главный бухгалтер Общества.*
3. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
4. Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
5. Определение органа печати, в котором будет опубликована информация о созыве собраний акционеров.

***В дополнение к Проектной декларации объекта долевого строительства,***

*опубликованной в газете «Звязда» № 53 от 21 марта 2009 г.*
*(с дополнениями в газете «Звязда» № 68 от 11 апреля 2009 г.)*

**Объектами долевого строительства являются:**
— 20 однокомнатных квартир площадью 41,05 кв.м — 47,23 кв.м;
— 10 двухкомнатных квартир площадью 61,66 кв.м — 64,75 кв.м;
— 20 трехкомнатных квартир площадью ≈ 92,4 кв.м.

***Информацию об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, оф. 1. Тел.: (017) 237 29 50, 237 29 51.***

У **суд Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **МАГАМЕДАВАЙ Інэсы Раядзінаўны**, 24 чэрвеня 1991 года нараджэння, ураджэнкі г. Маладзечна Мінскай вобласці, якая пражывала і зарэгістравана па адрасе: г. Маладзечна, вул. Міру, 56—17, апошняе месца навучання — Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны прафесійны ліцэй.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзянку І.Р. Магамедаву, паведаміць іх суду Маладзечанскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Минский городской центр недвижимости

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 8 сентября 2009 г. проводит открытый аукцион с условиями № 03-У-09 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитального строения (здания и сооружения) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске по 20 земельным участкам, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| Лот №: | Место расположения земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Кирова - ул. Свердлова - ул. Ульяновская - ул. Бобруйская | 0,8695 | Жилой дом повышенной комфортности | 642 642 825 | 57 837 850 | 13 793 326 | снос административной и жилой застройки, а также индивидуальных гаражей | 5 701 759 579 |
| 2 | ул. Казинца | 1,3608 | Многофункциональный торгово-общественный комплекс | 943 225 275 | 84 890 270 | 12 723 342 | малоэтажная застройка | 2 702 844 960 |
| 3 | ул. М. Богдановича - ул. Киселева - ул. Куйбышева - ул. Коммунистическая | 7,8698 | Квартал многофункциональной застройки | 6 603 106 950 | 594 279 630 | 65 126 275 | снос многоквартирных и индивидуальных жилых домов, металлических гаражей, инженерных зданий и сооружений | 37 212 869 104 |
| 4 | ул. Каховская - ул. Червякова - Сморговский тракт | 1,2581 | Жилой дом повышенной комфортности | 960 682 800 | 86 461 450 | 17 393 613 | усадебная застройка | 2 064 820 630 |
| 5 | ул. Бельского - ул. Пономаренко - пер. 3-й Харьковский - пер. 2-й Силикатный | 3,2649 | Квартал жилой застройки повышенной комфортности с помещениями общественного назначения | 2 213 020 875 | 199 171 880 | 24 568 361 | усадебные жилые дома и продовольственный магазин | 3 101 070 438 |
| 6 | пер. 2-й Радиаторный, 37 | 0,1278 | 1-2-квартирный малоэтажный жилой дом повышенной комфортности с приквартирным участком | 84 668 025 | 7 620 120 | 3 681 561 | снос ветхого нежилого строения | 138 360 816 |
| 7 | ул. Пономаренко - ул. Я.Мавра | 3,3874 | Многоэтажные жилые дома повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения | 2 275 946 775 | 204 835 210 | 15 410 860 | 1-3-этажная жилая застройка | 4 443 465 157 |
| 8 | ул. Толстого - ул. Дружная - ул. Вокзальная | 2,9264 | Многофункциональный общественно-торговый комплекс | 903 354 075 | 81 301 870 | 26 268 469 | 1-3-этажная нежилая застройка | 5 287 112 841 |
| 9 | ул. Солтыса - ул. Ваупшасова | 1,43 | Торговый центр | 1 125 356 850 | 101 282 120 | 7 062 045 | индивидуальные жилые дома | 386 602 640 |
| 10 | ул. Кольцова - пер. 1-й Кольцова | 0,5066 | Объект многофункционального общественного назначения | 389 945 775 | 35 095 120 | 7 250 718 | малоэтажная застройка | 551 646 905 |
| 11 | ул. 3-го Сентября - ул. Пинская | 0,4359 | Объект многофункционального общественно-производственного назначения | 323 997 900 | 29 159 810 | 7 505 325 | малоэтажные жилые дома | 631 133 966 |
| 12 | Парк им. Челюскинцев | 0,2818 | Развлекательный центр | 212 592 750 | 19 133 350 | 2 637 726 | снос административного здания открытого амфитеатра | 132 578 600 |
| 13 | ул. Мирошниченко | 0,5338 | Многоуровневая автостоянка с сопутствующим сервисом и помещениями торгового и общественного назначения | 383 629 875 | 34 526 690 | 4 770 959 | снос существующей плоскостной автостоянки № 31 УП «Гаражи, автостоянки и парковки» | 131 445 459 |
| 14 | пер. 5-й Брестский, пер. 1-й Южный | 3,9253 | Объект многофункционального общественно-производственного назначения с гараж-стоянкой | 2 448 687 750 | 220 381 900 | 20 092 266 | усадебные жилые дома | 1 802 442 264 |
| 15 | Парк им. Челюскинцев | 0,0723 | Павильон игровых автоматов | 59 251 800 | 5 332 660 | 2 746 652 | снос ветхих сооружений | 42 349 280 |
| 16 | пр. Дзержинского (согласно ПДП квартал 4) | 4,9729 | Многофункциональный комплекс общественного назначения, (административный, торгово-развлекательный и др.) квартал 4 | 4 560 970 575 | 410 487 350 | 26 055 415 | снос производственных и административных зданий, а также промсооружений | 30 860 282 796 |
| 17 | пер. 4-й Кольцова | 1,7124 | Многофункциональный объект общественного назначения | 1 318 086 150 | 118 627 750 | 5 581 133 | снос открытых стоянок автотранспорта | 1 207 473 656 |
| 18 | ул. Великоморская - ул. Либаво-Роменская | 1,3674 | Торгово-общественный центр в квартале 02 | 1 089 181 950 | 98 026 380 | 12 749 127 | индивидуальные жилые дома, другие строения | 4 301 895 666 |
| 19 | ул. Надеждинская | 1,75 | Многоуровневые паркинги с сопутствующим сервисом и помещениями торгового и общественного назначения № № 13, 14 по генплану | 1 357 080 450 | 12 213 760 | 12 662 854 | индивидуальные жилые дома, другие строения | 2 632 385 000 |
| 20 | ул. Либаво-Роменская | 2,0037 | Многоуровневые паркинги с сопутствующим сервисом и помещениями торгового и общественного назначения, кварталы 03-04 | 1 596 019 050 | 143 641 710 | 23 058 364 | индивидуальные жилые дома, другие строения | 3 326 265 000 |

Земельные участки свободны от застройки. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **8 сентября 2009 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в указанном выше (в таблице) размере, который составляет 9 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается **с 10.00 4 августа 2009 года** и заканчивается в **17.00 2 сентября 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона, Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация** о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов **www.mgcn.by.**

# КАСТЫНГ «МІС ІНТЭРКАНТЫНЕНТАЛЬ» САБРАЎ МЕНШ УДЗЕЛЬНІЦ, ЧЫМ «МІС БЕЛАРУСЬ»




## Затое на яго завітала Алена Прыгожая



**У гэтыя выхадныя ў Мінску колькасць сімпатычных, прыгожых і проста цікавых дзяўчат перавысіла ўсе магчымыя «нормы». Праўда, канцэнтравалася ўсё гэта хараство лакальна, у месцы правядзення адбору на конкурс «Міс Інтэркантыненталь-2009».**

На падыходзе да Нацыянальнай школы прыгажосці дзве сяброўкі актыўна спрачаліся:

— Мяне не адбяруць! — адмахвалася адна.

— Ну паспрабуй, ты ж нічога не губляеш! — сцвярджала другая.

— Добра, але тады, калі ўсё скончыцца, мы разам... палезем у фантан. Дамовіліся? — Заключыўшы гэта дзіўнае пары, дзяўчаты паспяшаліся да запаветных дзвярэй.

Такога ажыятажу, як на леташніх кастынгах «Міс Беларусь», чамусьці не назіралася, і ўсё ж ахвотных прадставіць нашу краіну на конкурсе прыгажосці «Міс Інтэркантыненталь» было даволі многа — кандыдаткі прыехалі не толькі з Мінска, але і з Бабруйска, Гомеля, Полацка, Гродна, Магілёва... Частку дзяўчат члены журы бачылі ўжо не ўпершыню і віталі, як старых знаёмых, аднак больш пільна прыглядаліся да навічкоў — тых, каму на час мінулых адбораў яшчэ не было 18. Уласна, дзеля пошуку гэтых маладых парасткаў цяперашні кастынг і наладзілі. «Мы хацелі б даць магчымасць дзяўчатам, якія падраслі, або якія раней з нейкіх прычын не ўдзельнічалі ў адборы на «Міс Беларусь», паказаць сябе, убачыць новыя вобразы, — тлумачыць выканаўчы прадзюсар АНТ Анжэліна Мікульская. — Але пры рашэнні, хто будзе прадстаўляць Беларусь, мы ўлічваем і ўдзельніц «Міс Беларусь-2008», якіх ужо добра ведаем».

Нягледзячы на абвешчаныя ўмовы кастынгу — грамадзянка Беларусі, не замужам, узрост ад 18 да 25 гадоў, рост не ніжэйшы за 175 см — здараліся казусы. Напрыклад, ужо на пашпартным кантролі высветлілася, што многія з прыгажунь замужнія. Хапала і грамадзянак Расіі, якія вучацца і жывуць тут, а таму палічылі ўмову грамадзянства неістотнай. Нарэшце, да 175 см росту таксама дацягвалі далёка не ўсе, нават з улікам высокіх абцасаў. «У мяне рост 164», — сарамліва прызналася адна з дзяўчат, якую да адбору ўсё ж дапусцілі.

«Навічкі», якія прыйшлі на прагляд упершыню, відавочна губляліся, і нават на простыя пытанні журы, куды ўвайшлі прадстаўнікі



канала АНТ, дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава, рэжысёр конкурсу «Міс Беларусь» і будучага шоу «Міс Інтэркантыненталь» Наталля Петухова і кампазітар Васіль Раінчык, адказвалі сцісла і няўпэўнена. Затое тыя з іх, хто пасля прадстаўлення і дэфіле пачуў фразу «прайдзіце на купальнікі» — гэта значыць, у другі тур, фота і дэфіле ў купальніках — на вачах ажывалі і расцвіталі ўсмешкамі.

«Мяне на кастынг адправіла бабуля! — прызналася адна з такіх шчаслівак, Алена Паспелава з Гродна. — Акрамя яе і мамы, якая заўжды мяне падтрымлівае, ніхто з родных і сяброў нават не ведае, што я паехала сёння ў Мінск. Дзяўчат, натуральна, многа, усе па-свойму прыгожыя і адметныя, і канкурэнцыя вельмі вялікая, але ўсё ж я спадзяюся, што я годны кандыдат». У 2007 годзе, узгадвае Алена, яна брала ўдзел у адборы на «Супермадэль свету», але тады не пашанцавала. Гледзячы на вельмі высокую і яркую дзяўчыну, у родным Гродне практычна ніхто не сумняваецца, што яна прафесійная мадэль. Але насамрэч ніякага вопыту супрацоўніцтва з мадэльнымі агенцтвамі дзяўчына не мае, і будучыню плануе звязаць зусім з іншай сферай — падала дакументы ў Інстытут правазнаўства.

Але галоўны сюрприз у першы дзень кастынгу здарыўся, калі струмень прэтэндэнтак амаль вычарпаўся.

— Добры дзень, я Алена Прыгожая, — сціпла назвалася перадапошняя дзяўчына, прымусіўшы ўсіх членаў журы здзіўлена ўскінуць вочы.

— Гэта прозвішча? — на ўсякі выпадак удакладніла камісія.

— Так, — усміхнулася дзяўчына. Аказваецца, «Елена Прекрасная» — так у 17-гадовай мінчанкі і ў пашпарце напісана. Зразумела, з такім імем, ды яшчэ з улікам знешніх даных — па ўсіх канонах конкурсаў прыгажосці — яна прайшла ў наступны тур. «Я лічу, што не прозвішча робіць чалавека і адлюстроўвае яго сутнасць, таму ў дзяцінстве, калі нехта і спрабаваў дражніцца, не звяртала ўвагі, — расказала дзяўчына. — А потым па жыцці прозвішча мне заўжды дапамагала, і я стараюся яго апраўдваць».

У кім з дзяўчат на кастынгу журы разгледзела новую «зорку», пакуль невядома. Хвалявацца кандыдаткам засталося ўсяго некалькі дзён. На наступным тыдні журы разам з заснавальнікамі конкурсу — прадстаўнікамі Сусветнай арганізацыі прыгажосці — вызначыцца, хто з беларусак пазмагаецца за тытул «Міс Інтэркантыненталь-2009». Часу на падрыхтоўку ў нашай канкурсанткі застанецца таксама нямнога, усяго месяц — бо ўжо з 11 па 13 верасня ўдзельніцы конкурсу, а гэта не менш як 60 прыгажунь з розных краін свету, прыбудуць у Мінск для падрыхтоўкі.

### Каця плюс ~~Саша~~?

Конкурс прыгажосці такога маштабу і значнасці, як «Міс Інтэркантыненталь», адбудзецца ў Беларусі ўпершыню. Шмат размоў было аб тым, што вядучым шоу стане горача любімы ў нашай краіне Аляксандр Рыбак, склаўшы пару «Супермадэлі свету-2006» мінчанцы Каці Даманьковай. Пераможца «Еўрабачання» горача вітаў гэту ідэю, і яго менеджары выкройвалі ў шчыльным графіку артыста пару дзён для паездкі ў Мінск. Але днямі з Нарвегіі прыйшла карэктная адмова. «Саша, узважыўшы свае магчымасці, палічыў, што гэта дастаткова адказны і сур'ёзны конкурс для першай спробы ў ролі вядучага, — ніколькі не крыўдуючы, патлумачылі супрацоўнікі АНТ. — Але ён гатовы выступіць у якасці выканаўцы, а таксама даць сольны канцэрт у Мінску. Адзінае «але» — 26 верасня ў Аляксандра вялікі канцэрт у Нарвегіі, і трэба ўвязаць пытанні з транспартам». Замест Рыбака, паводле слоў выканаўчага прадзюсара АНТ Анжэліны Мікульскай, разглядаюцца два іншыя цікавыя кандыдаты — «нашы беларусы, творчыя асобы, вядомыя як у Беларусі, так і на ўсёй постсавецкай прасторы; тандэм павінен атрымацца вельмі цікавы».

Ужо дакладна вядома, што конкурс адбудзецца ў сталічным футбольным Манежы, дзе плануецца ўсталяваць дзве вялікія сцэны і абсталяваць мноства каментатарскіх кабінак для прамой трансляцыі ва ўсе краіны-ўдзельніцы. Разглядаецца дзве канцэпцыі музычнага аздаблення шоу: будуць прадстаўлены або некалькі папулярных выканаўцаў з розных кантынентаў, або «адна, аднак найвялікшая зорка».

Удзельніц конкурсу «Міс Інтэркантыненталь» арганізатары правязуць з экскурсіямі па ўсіх рэгіёнах Беларусі, прычым у кожнай вобласці пакажуць галоўныя адметныя мясціны: Белавежскую пушчу, шахты ў Салігорску, аб'яднанне «БелАЗ». За 4 дні да шоу пачнуцца поўныя прагоны, з усімі дэкарацыямі і касцюмамі, а 27 верасня адбудзецца сам конкурс, які па маштабнасці і тэхнічнай складанасці абяцае пераўзысці ўсё, што мы раней бачылі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



# «БЕГ КАТАРЖНІКАЎ»



На беразе Мінскага мора 2 жніўня больш за семдзесят прыхільнікаў здаровага ладу жыцця ўзялі ўдзел у другім беларускім «Экстрым-Бегу». Дыстанцыя прабегу — пяць кіламетраў, прычым палова прайшла ў вадзе на глыбіні каля аднаго метра. Пераможцаў адзначылі ў дваццаці ўзроставых групах. Дарэчы, самым старэйшым удзельнікам даўно за восемдзесят. Ідэя экстрым-бегу прыйшла да нас з Польшчы, дзе спаборніцтвы праводзяць больш за дзесяць гадоў і называюць «Бег катаржніка».

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**





## КІШЭННІКАЎ ЗАТРЫМАЛІ Ў АЎТОБУСЕ

**Днём у Мінску ў аўтобусе 106-га маршруту праваахоўнікі затрымалі двух зладзеяў, якія цішком выцягнулі з сумачкі 47-гадовай жыхаркі сталіцы кашалёк.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 32- і 39-гадовых непрацуючых, здабычай якіх стала крыху больш як 141 тысяча рублёў, што ляжалі ў кашальку, узялі з доказамі віны. Пасля правядзення следчых дзеянняў абодва кішэннікі змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Між іншым, гэта ўжо не першае ў іх жыцці затрыманне: раней адзін з іх быў судзімы за крадзеж, другі — за захоўванне наркотыкаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ІСПАНСКАЯ КРЫЖАВАНКА

**Крыжаванкі такога кшталту звычайна называюць «іспанскімі».** У іх ёсць некалькі асаблівасцяў. Злева і справа ад «гульнявога поля» дадзены вызначэнні загаданых слоў па гарызанталях, а зверху і знізу — па вертыкалях. Дакладныя месцы для адгаданых слоў трэба шукаць самастойна. У дужках паказана, колькі літар павінна быць у адгаданых словах. І яшчэ: словы аддзяляюцца адно ад аднаго сама меней адной пустой клеткай. У якасці падказкі некаторыя з пустых клетак ужо заштрыхаваны.

Зверху: С/г машына для ўборкі бульбы [7]; Марскі паліп, які жыве калоніямі [5]; Гасцініца высокай катэгорыі [5]; Засеяны ўчастак поля [7]; Гатунак яблыкаў [4]; Пачцівы зварот да мужчыны ў Англіі [3]; Старажытны гатунак вінаграду [8]; Калючае пустазелле [4]; Тлусты мясны прадукт [4]; Род свістковай флейты [8]; Збожжавая с/г культура [4].

Злева: Сена, снапы конусам [4]; Апрацаваны пракаткай выраб [7]; Паркавы атракцыён [5]; Камбайн «Гомсельмаша» [7] (*гл. здымак*); Нізкі жаночы, дзіцячы голас [4]; Гледачы «за» або «супраць» артыста [5]; Расліна, якая любіць вільгаць [3]; Песня І. Лучанка і А. Куляшова [5]; Аматар паспяваць песні [5]; Штучнае рэчышча з вадой [5]; Крэпасць-цытадэль у Бухары, Хіве [3]; «Жызэль», «Карсар» (*аўтар*) [4].



Справа: Малая планета № 433 [4]; Аздоба, упрыгажэнне [6]; Герой многіх беларускіх казак [5]; Радзіма і царства Адысея [5]; Балет Я. Глебава [4]; У манголаў: асілак, мужны вояр [5]; Лінія гульцоў у футболе, хакеі [7]; Імклівы пародзісты конь [5].

Знізу: Прыяцель Маўглі ў казцы Кіплінга [3]; Драпежнік, тое, што і барс [7]; Азартная гульня з манетамі [7]; Міфічная прамаці чалавецтва [3]; Герметычна закрытае ёмішча [7]; «Чынгісхан», «Батый», раманы (*аўтар*) [2]; Адзінка вымярэння атмасфернага ціску [3]; Абласны горад у Туркменістане [4]; Сябры д'Артаньяна — ***, Партос, Араміс [4]; Каўказскі моцны напой [4].

**Склаў Яўген ЛЯХАЎ.**

## ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### ЭЦЮД І МІНІЯЦЮРА

Нацыянальны майстар спорту Пётр Шклудаў (Наваполацк) працягвае аўтарскі конкурс-8 заданнем № 14 — сваім эцюдам:



**Белыя:** дамкі a7, g1 (2). **Чорныя:** a3, a5, f4, g3 (4). Выйгрыш.

А гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель) даслаў у рэдакцыю сваю камбінацыйную мініяцюру для **бліца-49/4**:



**Белыя:** 6, 17, 38, 41, 43 (5). **Чорныя:** 9, 23, 27, 30, 32, 34 (6). Перамога белых.

Тэрмін для адказаў — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

Наступныя іх эцюд і мініяцюру разгледзьце па-за конкурсам:

**№ 1** (П. Шклудаў). **Белыя:** c3, h4, дамка e1 (3). **Чорныя:** c7, d8, e5, g7, h6 (5).

g3 (d6 A) b4 (f6) c5, a3 (e5) c5 (e7 BC) f8 (d4) b4 (e3) e1x. B (f4) a7 (e7) b8 (e3) f4, d8x. C (c7) a7 (d6) b8x. Варыянт жа A 1 ... cb6 застаецца за вамі.

**№ 2** (Л. Вітошкін). **Белыя:** 6, 29, 38, 40, 44 (5). **Чорныя:** 7, 9, 10, 27, 35 (5). Перавага белых — у гэтым пераканайцеся самастойна.

Будзем рады вашым рашэнням і гэтых твораў на 64 і 100-клетачных дошках.

### СПОСАБ СКЛАДАННЯ

Пры рашэнні чужых задумак узнікаюць і свае ўласныя ідэі. Гэта, між іншым, адзін з распаўсюджаных спосабаў складання шашачных кампазіцый. Ім карыстаюцца і чытачы-звяздоўцы. Вось што ў іх атрымалася па свежых слядах нашых публікацый:

**№№ 1-2** (Дзмітрый Камчыцкі, Магілёў). **Белыя:** a3, b4, f6, g1, g7 (5). **Чорныя:** a5, d2, d4, d6, e5, f4, h8 (7).

Версія праблемы П. Шклудава (аўтарскі-8/6): 1. gf2 2. fe3 3. f:b2 4. bc3 5. a:g1x.

**Белыя:** a7, b4, c5, e7, g5, h2, h6 (7). **Чорныя:** a3, b6, c7, e3, f2, f4, f8, g7 (8).

Апрацоўка эпізода партыі Белашэева з Колiным: 1. cd6 a:c5 2. d:b4 3. h:c5 4. ab8 5. b:e1 hg5 6. hg3 ef2 7. bc5 d:b6 8. ea5 9. a:c7x. На жаль, легальнасць пачатковага становішча не даказваецца, што ў апошні час дазваляецца, але з'яўляецца недахопам.

**№ 3** (Валерый Логвінаў, Мінск). **Белыя:** 16, 22, 33, 34, 35, 40 (6). **Чорныя:** 6, 8, 9, 12, 19, 28, 32, 45 (8).

Варыяцыя мініяцюры М. Грушэўскага (бліц-48/3): 1. 16-11 28:30 2. 35:2 6:28 3. 2-16x. Аднак магчыма і 3. 2-11x з таксама недакладным ударам.

### РАШЭННІ

**АЎТАРСКІ -8/11** (П. Шклудаў): gf2, f2, a7 (c3) b8, g5, f4x.

**ПА-ЗА КОНКУРСАМ** (П. Шклудаў): № 3. A (b4) f6, a3x.

**БЛІЦ-49/1** (М. Грушэўскі): 44, 41, 37, 4, 17, 38x.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск — | 5.28 | 21.02 | 15.34 |
| Віцебск — | 5.12 | 20.57 | 15.45 |
| Магілёў — | 5.18 | 20.52 | 15.34 |
| Гомель — | 5.21 | 20.43 | 15.22 |
| Брэст — | 5.44 | 21.16 | 15.32 |
| Гродна — | 5.51 | 21.10 | 15.19 |

**Месяц**

*Поўня 6 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

*Пр.* Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі.

*К.* Дамініка, Пратаза, Яна.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты — 4 жніўня



**1917 год** — нарадзіўся Янка Брыль, народны пісьменнік Беларусі. Закончыўшы польскую сямігадовую школу, паступіў у гімназію, аднак не змог там вучыцца з-за матэрыяльных цяжкасцяў, займаўся самаадукацыяй. З 1938 года стаў публікаваць вершы і публіцыстыку ў віленскім беларускім часопісе «Шлях моладзі». З 1939 года служыць у марской пяхоце войска польскага. У верасні таго ж года ў баях з нямецкімі акупантамі пад Гдыняй трапіў у палон, аднак змог уцячы і вярнуўся на Радзіму. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызаніў, рэдагаваў падпольную газету «Сцяг свабоды». Пасля вайны актыўна займаўся літаратурнай дзейнасцю: «У Забалоцці днее», «Золак, убачаны здалёк», «Птушкі і гнёзды», «Жменя сонечных праменняў» і інш.

**1586 год** — сэр Томас Хэрыёт прывёз у Еўропу (Англія) бульбу. Спачатку на кантыненце яе ўспрымалі як рэдкую экзатычную расліну і высаджвалі ў найлепшых батанічных садах. Была бульба і ў некаторых прыватных калекцыях, дзе яе вырошчвалі з-за вытанчанай прыгажосці кветкі.

## Цытата дня:

*«Пра жанчын заўсёды знойдзецца сказаць што-небудзь новае, пакуль хоць адна з іх застанецца на зямным шары».*

**Жан дэ Буфлер (1737—1815), французскі палітычны дзеяч, пісьменнік.**

## ПАСАДЖОНЫЯ БАЦЬКІ

Свет і сусвет чалавека

**Калі ў жаніха ці нявесты нехта з бацькоў (маці або бацька) памёр, калі бацькі скасавалі шлюб або па нейкіх іншых прычынах на момант вяселля не з'яўляюцца поўнай сямейнай парай, то народная традыцыя забараняе ім удзельнічаць у вясельным абрадзе ў якасці галоўных абрадавых чыноў, каб не перадаць маладым сваю «нешчаслівую долю». Каб пазбегнуць паўтарэння-пераемнасці лёсу бацькоў, для правядзення ключавых рытуалаў вясельнай урачыстасці — провадаў маладых у храм ці ЗАГС і сустрэчы іх пасля вянчання ці рэгістрацыі шлюбу — выбіралі пасаджоных бацькоў. Імі стараліся выбраць шчаслівую сямейную пару, якая абавязкова павінна была мець сваіх дзяцей. Гэта маглі быць сем'і роднага дзядзькі ці цёткі, больш далёкіх сваякоў, добрых знаёмых ці сяброў.**

● Абрадавую ролю пасаджоных бацькоў не могуць выконваць хросныя бацькі. Пасаджоныя бацькі функцыянальна замяшчаюць родных, таму яны не маюць права быць разам з маладымі ў ЗАГСе ці храме. Іх рытуальная функцыя — адправіць і сустрэць у тым жа месцы. У храме ж побач з жаніхом і нявестай павінны знаходзіцца іх хросныя бацькі. Калі ж на іх ускласці паўнамоцтвы пасаджоных, то, адпаведна, яны не змогуць прысутнічаць у царкве побач з маладымі.

● Як прыклад, жыццёвая сітуацыя. У сям'і памірае бацька. Маці, якая засталася з дачкой, стварае новую сям'ю. Ад другога шлюбу ў яе нараджаецца яшчэ адна дачка. Калі замуж будзе выходзіць яе першая дачка, то маці не будзе мець права выконваць абрад провадаў — гэта выканаюць пасаджоныя бацькі. У выпадку вяселля другой дачкі гэтыя бацькі ўжо змогуць асабіста выканаць важны сімвалічны рытуал.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

**Законы халасцяцкага жыцця абвяшчаюць, што калі гэта нельга зварыць або пасмажыць, то гэта трэба тэрмінова патушыць...**

**...пакуль не згарэла ўсё ўшчэнт...**

☺

— Можна цябе сюды на хвілінку?

— Ну нясі...

☺

**П'яная бойка ў Чыжоўцы перарасла ў вяселле.**

☺

— Глядзіце, як хораша бяжыць гэты мужчына.

— Адразу відаць, ад жанчыны!

☺

**Шатландскія дзеці маюць перад астатнімі тую перавагу, што могуць трымацца не толькі за мамчыну, але і за татаву спадніцу.**

☺

Жанчына — сяброўцы, якая выбірае падарунак мужу:

— А навошта жанатаму мужчыну такі вялікі партманет?

☺

**На лекцыі ў медінстытуце:**

**— Медыцына — навука недакладная. Грошы назад не аддавайце!**

☺

Жонка — мужу:

— У цябе не атрымаецца мяне адгаварыць! Я усё адно кінуся з балкона! Не хачу жыць з такім бабнікам!.. І перастань мяне падштурхоўваць!




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4176. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12